

СВЯТА ПТУШАК НА ТУРАЎШЧЫНЕ 8

ТВОРЧАЯ СІЛА МАСТАКА МІХАІЛА КРАТА 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 САКАВІКА 2022 г. ЧАЦВЕР № 62 (29684)

# АЛІМПІЯДНІКІ АД ПРАЦЫ



У Магілёве гэтымі днямі праходзіць заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» сярод навучэнцаў агульнай сярэдняй, прафесійнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У алімпіядзе бяруць удзел 36 хлопчыкаў і 38 дзяўчынак з усіх абласцей і горада Мінска.

**Фота БелТА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль МАРКЕВІЧ, міністр культуры:**

*«За розумы, сэрцы і душы маладых людзей ідзе сапраўдная інфармацыйная вайна. Вельмі важна, каб мы ні ў якім разе не страцілі гістарычную праўду, ні ў якім разе пад уздзеяннем звонку не здрадзілі нашым героям — тым людзям, якія здабывалі Вялікую Перамогу. У нашай краіне гэта немагчыма па сутнасці сваёй, пакуль жывуць нашы ветэраны, пакуль жывая памяць аб тым страшным ваенным ліхалецці, пакуль не зарастуць дарогі, якія вядуць да мемарыяльных комплексаў і абеліскаў. Пераажыўшы страшэнныя беды, страты, якія прынесла Вялікая Айчынная вайна, пераажыўшы Другую сусветную вайну, чалавецтва павінна задумацца. Фашысцкая ідэалогія не павінна ніколі адрадзіцца».*

## КАРАТКА

- **Карпенка: фактаў сур'ёзнага аспрэчвання вынікаў рэспубліканскага рэферэндуму няма.**
- Беларусь у 2021 годзе на трэць нарасціла экспарт у Пензенскую вобласць Расіі.
- **Агульнагарадскі суботнік пройдзе ў Магілёве 16 красавіка.**
- БелАЗ створыць 200-тонны экскаватар.
- **Браканьеры застрэлілі зубра ў Пружанскім раёне.**
- СААЗ: смяротнасць ад COVID-19 вырасла ў свеце за тыдзень на 43 %.
- **Кантракты на 1 млрд расійскіх рублёў падпісаны па выніках прадфоруму ў Санкт-Пецярбургу.**

ISSN 1990 — 763X

Прафарыенцір

## БУДУЧЫНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ТУТ!

Рэктар БДПУ — пра місію настаўніка, пакліканне і важнасць правільнага выбару



**Ці кожны чалавек з дастатковым узроўнем ведаў можа стаць педагогам? Што ў прафесіі настаўніка самае складанае? Ці плануецца адкрываць у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце новыя факультэты або новыя спецыяльнасці? Гэтыя і многія іншыя пытанні прагучалі падчас сустрэчы рэктара БДПУ Аляксандра ЖУКА з удзельнікамі профільнай змены «Педклас — гэта клас!», якая прайшла ў мінскім адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар».**

СТАР. 5

Лічбавы беларус

## ЭЛЕКТРОННЫ КАБІНЕТ КАРЫСТАЛЬНІКА

### Для заказу паслуг і ўзаемадзеяння з дзяржорганамі анлайн

**Усе сучасныя беларусы (больш як дзевяць мільёнаў чалавек) сёння маюць персанальны электронны кабінет, але далёка не кожны ведае пра яго існаванне. Ствараецца такі кабінет па выяўленчым прынцыпе на аснове дэперсаналізаваных даных. Простымі словамі — чалавек нарадзіўся, звесткі пра яго з'явіліся ў рэгістры насельніцтва, а на адзіным партале электронных паслуг (АПЭП) для яго завялі асабісты электронны кабінет. Кабінет лічыцца неактыўным, пакуль чалавек у яго не ўвайшоў. Зараз яго «адамкнулі» толькі каля 167 тысяч асоб, аднак такіх прасунутых карыстальнікаў становіцца ўсё больш, кажуць эксперты электроннай галіны. Праз гэты рэсурс можна заказаць і атрымаць пэўныя адміністрацыйныя працэдуры і паслугі, сюды ж прыйдуць звесткі пра ўсе стасункі ўладальніка кабінета з дзяржорганамі, а таксама дашлюць рознага роду паведамленні, якія чалавек не заказваў: штрафы, позвы і іншае. Як працуе электронны кабінет, навошта ён, чым карысны, ці варта ім увогуле карыстацца, расказалі ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг (НЦЭП).**

СТАР. 7

Інтэграцыя

# СТАЎКА НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ І ГІСТАРЫЧНУЮ ПАМЯЦЬ

**Другі дзень рабочага візіту ўрадавай дэлегацыі Беларусі на чале з прэм'ер-міністрам Раманам ГАЛОЎЧАНКАМ у Санкт-Пецярбург пачаўся цырымоніяй ускладання вянка да манумента «Маці-Радзіма» на Піскароўскіх мемарыяльных могілках.**

Таксама кіраўнік беларускага ўрада пакінуў запіс у кнізе памяці. «Эмоцыі перапаўняюць, калі знаходзішся тут, у Піскароўскім мемарыяле — месцы святой памяці і смутку аб трагічных і гераічных падзеях нашай агульнай гісторыі. Ратны подзвіг нашых народаў у Вялікай Айчыннай вайне, цаной мільёнаў жыццяў, якія адстаялі права на жыццё, свабоду і незалежнасць, будзе жыць у стагоддзях», — сказана ў запісе.

Пасля рабочы графік працягнуўся адкрыццём беларуска-расійскага бізнес-форуму «Беларусь — Санкт-Пецярбург: погляд у будучыню», перадае БелТА.

«Асаблівае значэнне бізнес-дыялог набывае ў кантэксце санкцыйнага ціску заходніх краін на нашы дзяржавы. Магчыма, за непрацяглы час вострая фаза спадзе, дзелавыя колы знойдуць магчымасці працаваць у гэтых умовах. Тым не менш усе мы павінны разумець, што супраць нас гуляюць «удоўгую», ніхто не хоча мірыцца з тым, каб нашы дзяржавы былі тэхналагічнымі і самастойнымі, суверэннымі, незалежнымі. У гэтых умовах наш галоўны адказ — пераацэнка таго шляху, па якім мы развіваемся, і, вядома ж, стаўка і апора на нашы ўласныя сілы, на наш навуковы і інтэлектуальны патэнцыял», — мяркуе Раман Галоўчанка.

Ён адзначыў, што ў гэтай няпростай сітуацыі бізнес мае патрэбу ў падтрымцы з боку дзяржавы. На нацыянальных узроўнях у Беларусі і Расіі прымаюцца меры па змякчэнні негатыўнага эфекту ад абмежавальных мер. Асаблівую ўвагу ўдзельнікам форуму беларускі прэм'ер параіў удзяліць тэмам узаемнай пераарыентацыі паставак тавараў экспарту ў недружалюбныя краіны, а таксама актывізацыі вытворчай і тэхналагічнай кааперацыі.

На парадку дня

# «Ад дысцыпліны, згуртаванасці залежыць сур'ёзны складнік любога выніку»

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА працягвае камандзіроўкі ў рэгіёны і сустрэчы з працоўнымі калектывамі. Учора ён узяў удзел у пасяджэнні Салігорскага райвыканкама.**



Фота БелТА.

## ПРА САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ І МЕРЫ АДКАЗНАСЦІ

У цэлым на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні дысцыпліны. «Сёння ад дысцыпліны, арганізаванасці на ўсіх узроўнях (і кіраўнікоў, і працоўных калектываў, кожнага на сваім рабочым месцы) залежыць развіццё нашай дзяржавы. Ва ўмовах санкцый, выклікаў і новых пагроз, інфармацыйнай вайны ад дысцыпліны, згуртаванасці залежыць сур'ёзны складнік любога выніку», — падкрэсліў Ігар Сергеенка ў размове з журналістамі, паведамляе БелТА.

Падрабязна разгледжаны на пасяджэнні існуючыя тэндэнцыі змяншэння колькасці траўміравання і гібелі людзей, меры для гэтага, якія прымаюцца па розных напрамках. Размова ў тым ліку ішла аб прафілактыцы ДТЗ і гібелі людзей, вытворчага траўматызму, гібелі пры пажарах, у вадаёмах, ад супрацьпраўных дзеянняў, у выніку атручэнняў і злоўжывання наркатычнымі рэчывамі і алкаголем.

На пасяджэнні падкрэслілі, што работу па выратаванні, ахове жыцця і здароўя грамадзян дзяржава і ў далейшым будзе забяспечваць, але людзі павінны і самі разумець меру сваёй сацыяльнай адказнасці.

У сваю чаргу, Ігар Сергеенка звярнуў увагу, што ў абноўленай Канстытуцыі прадугледжаны не толькі гарантыі, але і меры сацыяльнай адказнасці. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што ў рамках работы над заканадаўствам у межах развіцця Канстытуцыі трэба па канкрэтных пазіцыях падумаць, дзе і як тое адлюстраваць.

«Сёння актуальнае пытанне аб тым, што ж павінны рабіць самі грамадзяне, — аб мерах сацыяльнай адказнасці. Дарэчы, гэтая норма знайшла адлюстраванне ў абноўленай Канстытуцыі. Таму ў законапраектах, якія рушаць услед за Канстытуцыяй, трэба будзе таксама прапісаць і адказнасць нашых грамадзян за выкананне тых ці іншых канкрэтных нормаў, якія ўплываюць і на дысцыпліну, і на бяспеку», — адзначыў Ігар Сергеенка.

## СІТУАЦЫЯ Ў КАЛІЙНАЙ ГАЛІНЕ

Становішча няпростае, але некрытычнае. Так пракаментаваў журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка сітуацыю ў калійнай галіне па выніках пасяджэння Салігорскага райвыканкама.

«Абстаноўка няпростая, але некрытычная. Ідзе пошук рашэнняў. Прадпрыемства працуе, — перадае яго словы БелТА. — Ва ўмовах санкцый, штучна створаных нам праблем з транспарціроўкай прадукцыі па вядомых каналах праз порты Балтыі (апошнім часам парушана транспарціроўка і праз Украіну) даводзіцца перабудоўваць логістыку, працаваць з іншымі партнёрамі, працаваць з Кітаем, больш актыўна працаваць з Расіяй».

Разам з тым кампанія дынамічна развіваецца, абстаноўка ў калектыве стабільная, бо працуе ў гэтым плане не толькі кіраўніцтва прадпрыемства, але і ўрад. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу, што беларуская калійная ўгнаенні неабходныя ў іншых краінах. «Тыя палітыкі, якія ўводзілі санкцыі адносна Беларусі, не думалі аб сваім народзе. Санкцыі б'юць не толькі па тых, супраць каго ўводзяцца, але і па тых, хто ўводзіць. Яскравы прыклад — угнаенні. Тым больш напярэдадні пасяўных работ», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

Парламенцкі дзённік

# «У ВУЗКІМ СКЛАДЗЕ ШАБЛОНАДУМЦАЎ»

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ зрабіў заяву ў сувязі з рашэннем Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы прыпыніць адносіны з беларускімі ўладамі.**

«ПАСЕ насуперак каштоўнасцям, якія дэкларуе, пацвердзіла сваю негатоўнасць да адкрытага дыялогу з беларускім парламентам. Прынятае асамблеяй рашэнне фактычна блакіруе магчымасць камунікацыі, заснаванай на выкананні прынцыпаў аб'ектыўнасці, адкрытасці і збалансаванасці падыходаў і меркаванняў. Мы ўпэўненыя, што гэтае рашэнне наносіць шкоду перш за ўсё самой ПАСЕ, дзе заходнееўрапейскія калегі пачынаюць дзейнічаць у атмасферы аднабаковага і аднабокага інфармацыйнага ўздзеяння», — сказаў Андрэй Савіных.

Паводле яго слоў, беларускі бок быў гатовы абмяркоўваць палітычную сітуацыю па любых тэмах ва ўмовах плюралізму меркаванняў і ацэнак. Гэта наглядна паказала пасяджэнне палітычнага камітэта ПАСЕ з удзелам прадстаўніка беларускага парламента, дзе абмяркоўваліся вынікі канстытуцыйнай рэформы ў Беларусі.

«Якраз у гэтым і заключаецца сэнс міжнароднага міжпарламенцкага супрацоўніцтва — развіццё прафесійнага, карэктнага і паважлівага дыялогу. Мяркуем, што сёння ПАСЕ адчувае сур'ёзны дыскамфорт ад з'яўлення ўдзельнікаў дыскусій, якія адважваюцца выступаць з крытыкай у адрас заходняга блока і дэградуючай сістэмы заходніх каштоўнасцяў і мадэляў сацыяльнага кіравання. Асамблея палічыла за лепшае працягваць абмеркаванне рэгіянальных пытанняў у вузкім складзе «шаблонадумцаў», падпарадкаваных канфрантацыйнай логіцы» , — дадаў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.

На думку Андрэя Савіных, такі падыход непазбежна прывядзе да адрыву ад рэальнасці і рашэнняў, якія прымаюцца на аснове недасканалага блокавага мыслення. «Тым не менш мы ўпэўненыя, што рэальнае жыццё рана ці позна прымусіць дэпутатаў ПАСЕ адмовіцца ад «групаўшчыны» і заняцца вырашэннем рэальных праблем, а таксама адмовіцца ад гучных, але дылетанцкіх і бессэнсоўных палітычных заяў», — сказаў парламентарый.

Андрэй Савіных адзначыў журналістам, што апошнім часам беларускія дэпутаты больш супрацоўнічалі з Саветам Еўропы, і там краіна дэманстравала канструктыўны падыход.

«Мы далучаліся да канвенцый Савета Еўропы ў вузкаспецыяльных сферах. Напрыклад, у сферы барацьбы з камп'ютарнымі злачынствамі, утрымання звяволеных, абароны дзяцей ад сексуальнай эксплуатацыі. Гэта былі кропкавыя галіны, у якіх вопыт Савета Еўропы быў нам карысны. Мы гэта бачылі і выкарыстоўвалі гэты вопыт адразу ў нашым заканатворчым працэсе», — расказаў Андрэй Савіных.

Ён растлумачыў, што ПАСЕ — гэта палітычны орган, які сёння дэманструе пазіцыю «павярхоўнага палітыканства» і не можа сабе дазволіць плюралізм меркаванняў.

Як паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў, 15 сакавіка на пазачарговай сесіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы ў Страсбургу было прынята заключэнне «Наступствы агрэсіі Расійскай Федэрацыі супраць Украіны». Ключавым пасылам дакумента стаў заклік выключыць Расію з Савета Еўропы. Таксама акт утрымлівае пункт аб прыпыненні ўзаемадзеяння з беларускімі ўладамі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кіраўнік польскага ўрада заявіў, што русафобства стала мэйнстрымам у Еўропе

**Прэм'ер-міністр Польшчы Матэвуш Маравецкі заявіў падчас прэс-канферэнцыі, што сёння русафобства стала ў Еўропе мэйнстрымам, і гэта рэальнасць, у якой даводзіцца функцыянаваць, перадае ТАСС.**

Палітык таксама дадаў: тое, што раней лічылася неабходнасцю змяншэння цэн шляхам пошуку танных энергарэсурсаў у Расіі, сёння гэта — плата за «ваенную машыну Пуціна».

30 сакавіка прэм'ер Польшчы прадставіў «план дэрусіфікацыі энергетыкі» краіны, заявіўшы аб намерах цалкам адмовіцца ад імпарту расійскіх энергарэсурсаў — вугалю, нафты і газу — да канца 2022 года. Раней з ініцыятывы ўладаў Польшчу пакінулі 45 расійскіх дыпламатаў. Пасол Расіі ў Варшаве Сяргей Андрэеў заявіў, што бягучая сітуацыя паміж РФ і Польшчай можа прывесці да ўзаемнага закрыцця польскіх пасольстваў, хоць да разрыву адносін не дойдзе.

## МЗС Кітая не пацвердзіла гатоўнасць Пекіна выступіць гарантам бяспекі Украіны

**Кітай працягне выконваць канструктыўную ролю і аказваць садзейнічанне для нармалізацыі сітуацыі вакол Украіны, але пры гэтым будзе прытрымлівацца ўласных метадаў. Аб гэтым заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Ван Вэньбінь, перадае ТАСС.**

Такім чынам ён адказаў на пытанне журналістаў аб тым, ці гатовы кітайскі бок выступіць гарантам мірнага пагаднення паміж Масквой і Кіевам. «Мы маем намер узаемадзейнічаць з кожным з зацікаўленых бакоў для таго, каб узброены канфлікт паміж Расіяй і Украінай завяршыўся ў найбліжэйшы час», — сказаў кітайскі дыпламат.

Раней кіраўнік МЗС КНР Ван І падчас перагавораў з расійскім калегам Сяргеем Лаўровым у кітайскім горадзе Тунсі заявіў, што адносіны Кітая і Расіі захавалі правільны кірунак.

## Стваральнік скульптур у форме сабакі з паветраных шарыкаў адправіць свае работы на Месяц



**На Месяц адправяць скульптуры амерыканскага мастака, вядомага сваімі скульптурамі ў форме сабакі з паветраных шарыкаў.**

Творы мастацтва раней ужо адпраўлялі ў космас, але ніводнаму з іх яшчэ не ўдалося сесці на паверхню Месяца. Скульптуры створыць амерыканец Джэф Кунс, пры гэтым з кожнай з іх будзе асацыіравана ўнікальная лічбавая NFT-копія, ахаваная ад падробкі. «Я хацеў стварыць NFT-праект з гістарычным значэннем, які быў бы ўкаранёны ў гуманістычнай і філасофскай думцы, — тлумачыць мастак. — Нашы дасягненні ў космасе дэманструюць бясконцасць чалавечага патэнцыялу. Гэтыя ідэі знаходзяцца ў цэнтры майго NFT-праекта, які можна разумець як працяг чалавечага натхнення за межы нашай планеты». Пакуль незразумела, якія менавіта скульптуры мастак адправіць у космас. Вядома толькі, што яны павінны паляцець на Месяц у ліпені 2022 года на рабатызаваным апараце кампаніі Intuitive Machines.

Прадпрымальніцтва

# СТАРТАПЫ Ў ЭКАНОМІЦЫ ПАД ДЭВІЗАМ «ЗАРАЗ МЫ ЗМОЖАМ ЗРАБІЦЬ І САМІ»

## Галоўнай ідэяй нашай эканомікі ў найбліжэйшы час стане развіццё новых вытворчасцяў у галіне імпартазамяшчэння

**Набірае папулярнасць Рэспубліканская конкурсная праграма Белаграпрамбанка «Стартап-марафон», якая рэалізоўваецца пры падтрымцы Міністэрства эканомікі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Беларускага інавацыйнага фонду і прадстаўнікоў бізнес-супольнасці. Яна стартавала ў пачатку сакавіка.**

### Іграе ролю не ўзрост, а хуткасць асваення ніш

На прэс-канферэнцыі з нагоды запуску конкурснай праграмы **начальнік упраўлення эканомікі інавацыйнай дзейнасці Міністэрства эканомікі Дзмітрый КРУПСКІ** адзначыў, што мы ўступілі ў эпоху ўзрушэнняў, і лейтматывам гэтай эпохі з'яўляецца тое, што раней адносна адзіная планетарная цывілізацыя сёння распадаецца на кантынентальныя, рэгіянальныя сістэмы. Мяняюцца бізнес-мадэлі, канфігурацыя рынку. Калі раней зараблялі грошы праз выхад на сусветны рынак, то цяпер, у святле таго, што адбываецца, ключавымі стануць праекты, звязаныя з імпартазамяшчэннем.

«На нашых вачах ідзе змена і практыкі, і сусветнага эканамічнага ландшафту. У гэтым кантэксце нашы намаганні накіраваныя на тое, каб стварыць камфортныя ўмовы для новай генерацыі прадпрымальнікаў», — сказаў Дзмітрый Крупскі. Мінэканомікі мае намер актыўна падтрымліваць стартап-рух. «Стаўка будзе рабіцца перш за ўсё на вытворчыя стартапы. Сам кантэкст гэтай эпохі такі, што з прычыны вызвалення рынкаў з'яўляецца даволі шмат цікавых і перспектыўных ніш. Пытанне ў тым, наколькі хутка прадпрымальнікі змогуць гэтыя рынкі заняць і асвоіць», — адзначыў начальнік упраўлення.

Гэта ж датычыцца і рэалізацыі паспяховых стартапаў: у краіне ствараюцца камфортныя ўмовы.

«Стартап-марафон» — адно з флагманскіх мерапрыемстваў у гэтым кірунку. Яго ключавая мэта — развіццё і падтрымка стартап-руху і малога інавацыйнага прадпрымальніцтва ў краіне. Узроставых абмежаванняў для ўдзельнікаў няма, больш за тое, заявіць аб сабе могуць як пачаткоўцы — як уладальнікі стартап-ідэй, так і дзеючыя стартапы Беларусі. Вызначаны чатыры асноўныя кірункі: AgroTech (тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы), Creative (лічбавыя тэхналогіі ў медыя, дызайне і культуры), Fintech (фінансавыя тэхналогіі, сэрвісы і электронная камерцыя), TechNet (перадавыя вытворчыя тэхналогіі).

### Праверка канкурэнтаздольнасці

У рамках марафону мяркуецца актыўнае прыцягненне шырокага кола ўдзельнікаў. У прыватнасці, запланавана правядзенне серыі пілотных семінараў у рэгіёнах краіны. І першы з іх прайшоў у Магілёве. Любы бізнес — свайго роду машына па здабыванні грошай.

«Пры стварэнні бізнесу можна ісці метадам спроб і памылак. А можна засцерагчыся ад памылак, праверыць сябе і сваю бізнес-ідэю, яе канкурэнтаздольнасць. Падчас «Стартап-марафону» ідэю пад рознымі ракурсамі будуць разглядаць эксперты. Больш за тое, тыя бізнес-ідэі, якія акажуцца, па іх думку, найбольш жыццяздольнымі і перспектыўнымі, атрымаюць сур'ёзныя прызы. Разлічваем, што ў рамках гэтага праекта зможам вывесці наш стартап-рух на якасна новы ўзровень, адаптаваўшы яго да сённяшніх умоў, сарыентаваўшы ў першую чаргу на рэалізацыю праектаў па імпартазамяшчэнні. Выходзіць на глабальны рынак цяпер будзе ўсё цяжэй», — дадаў Дзмітрый Крупскі.

Раней **кіраўнік Мінэканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** расказаў, што праграмы па імпартазамяшчэнні ў Расію стануць больш даступныя прадпрыемствам Беларусі, якія займаюцца выпускам машынабудаўнічай тэхнікі і абсталявання. Ён падкрэсліў, што гэта акно магчымасцяў, яго неабходна максімальна хутка выкарыстоўваць, каб нарасціць аб'ёмы выпадальнага экспарту.

Конкурсная праграма будзе доўжыцца 9 месяцаў. Пазмагацца за грашовыя прызы ў «Стартап-марафоне» і атрымаць экспертную падтрымку змогуць распрацоўшчыкі інавацыйных тэхналогій у самых розных сферах дзейнасці: сельскай гаспадарцы, дызайне, культуры, вытворчасці і фінансах.

Конкурсная праграма будзе праходзіць у тры этапы, пачынаючы з сакавіка і да лістапада ўключна.

«Мы хочам выявіць маладых крэатыўных прадпрымальнікаў, якія віруюць ідэямі, хочуць займацца бізнесам», — сказаў **начальнік упраўлення развіцця экасістэмы ААТ «Белаграпрамбанк» і старшыня арганізацыйнага камітэта Рэспубліканскага конкурсу «Стартап-марафон» Дзмітрый ПРЫМАК.**

Прадстаўнік банка адказаў на пытанне, ці плануе фінустанова і ў далейшым падтрымку цікавых бізнес-ідэй і праектаў удзельнікаў конкурсу, у прыватнасці па тэхналогіях у сельскай гаспадарцы. Можа быць, яны атрымаюць нейкія льготы па крэдытах?

Дзмітрый Прымак растлумачыў, што банк зацікаўлены дапамагаць у адаптацыі новых тэхналогій у сельскай гаспадарцы і перш за ўсё прасоўваць тэхналогію дакладнага земляробства. «Мы гэтым ужо займаемся. І як адзін з фактараў стымулявання разглядаем крэдытныя прадукты, якія гэтую ідэю будуць матываваць», — адзначыў спікер.

Дзмітрый Прымак расказаў, што прызавы фонд ад Белаграпрамбанка арыентаваны на 4 намінацыі і складае каля 16 тысяч беларускіх рублёў. Галоўны прыз конкурснай праграмы — 4 гранты па 500 базавых велічынь для пераможцаў у кожнай намінацыі.

Паводле яго слоў, фармат конкурсу прадугледжвае, што партнёры банка могуць таксама засноўваць свае прызы і прэферэнцыі. Прыцягваюць да праграмы і рэгіянальных партнёраў, так што стартапы могуць атрымаць падтрымку і ў рэгіёнах. Паступіла ўжо больш за 20 заявак на ўдзел у марафоне, а чакаецца іх значна больш, заяўкі ідуць з усіх рэгіёнаў Беларусі.

### Лёгкі старт без фінансавай нагрузкі

Вывучэнне новых рынкаў, развіццё стартап-напрамкаў у нас толькі пачынаецца, і марафон павінен стаць адным са штогадовых конкурсаў, лічыць **кіраўнік па інвестыцыях і праграме «Іскра», аддзела ўпраўлення навукова-тэхнічных інавацый кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка Дзяніс СІЛЬЧАНКА.** Ён таксама паведаміў, што ў кампаніі распрацоўваюць сваю намінацыю ў рамках гэтага марафону, пра якую абвесціць крыху пазней.

Дзяніс Сільчанка дадаў, што ўдзельнікі ўжо падчас конкурсу атрымліваюць шэраг бонусаў, у тым ліку ад індустрыяльнага парка. Гэта пляцоўкі з шэрагам ільгот, заканадаўча зацверджаных, што дазваляе знізіць фінансавую нагрузку для стартапаў, паколькі бясплатна аказваюцца кансалтынгавыя, юрыдычныя, бухгалтарскія і іншыя паслугі.

Калі ў ацэнцы стартапаў будуць удзельнічаць прадстаўнікі рэальнага сектара, ці могуць яны перанакіраваць некаторыя бізнес-ідэі канкурсантаў у неабходнае ім рэчышча, каб затым укараніць у сябе? На гэтае пытанне прадстаўнік Мінэканомікі растлумачыў, што ў рамках конкурсу створаны аўтарытэтны экспертны савет. Ці варта перанакіраваць нейкія цікавыя ідэі на рэалізацыю ў рэальным сектары, залежыць ад жыццяздольнасці стартапу і ці захоча прадпрымальнік убудавацца ў нейкі кааперацыйны ланцужок. Пра гэта можна будзе меркаваць ужо бліжэй да завяршэння марафону.

**Дырэктар Беларускага інавацыйнага фонду Дзяніс КАРЖЫЦКІ** падкрэсліў, што сёння вырас попыт на інавацыі. І шэраг ідэй зможа ўвасобіцца ў бізнес, а таксама атрымаць падтрымку на прадпрыемствах рэальнага сектара, якія зацікаўлены ўкараняць перспектыўныя распрацоўкі ў сябе. Паводле яго слоў, гэтая работа будзе спрыяць як паспяховаму імпартазамяшчэнню, так і выхаду на новыя рынкі, у тым ліку на рынкі Азіі і іншыя. І засваенне гэтых рынкаў без інавацый, новых тэхналогій, маладых крэатыўных каманд, напэўна, немагчыма.

**Старшыня Асацыяцыі трэкераў і бізнес-кансультантаў Юлія БАШКО** дадала, што эксперты з іх боку таксама хочуць падтрымаць стартaпераў і вытворцаў. «Асацыяцыя створана менавіта для таго, каб акумуляваць экспертызу трэкераў і кансультантаў, якая датычыцца бізнесу і стартапаў. Акрамя стартапаў, вельмі хацелася б на нашым марафоне сустрэць пастаянныя кампаніі, якія вырашылі зрабіць спін-офы. Гэта вельмі актуальна, таму што на базе такіх кампаній можна развіваць новы напрамак, які будзе стартапам з велізарным патэнцыялам», — дадала яна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

По сутнасці

# ФІЛАСОФІЯ ВАНТРОБЫ



**Прыемнага апетыту. Альбо смачна есці. Каму і як даспадобы. Дэмакратыя. У тым ліку і моўная. Як тушонка? Некаторыя бралі скрынямі. Муку — мяхамі. Разумею. Беларускае харчаванне, не долары. Свайго курсу і якасці не страчвае. Але навошта соль было скупляць? Гэта так трэба НЕ ВЕРЫЦЬ у сваю краіну. Гэта трэба НЕ ВЕДАЦЬ сваю краіну.**

Калі верыць вучоным: запасы каменнай солі ў краіне амаль невычэрпныя. Калі верыць легендам, то соль гэтая ўтварылася ад слёз зямлі беларускай. Якая шмат пакутавала і нацярпелася. Якая маці можа спакойна назіраць, калі крыўдзяць яе дзяцей у бацькоўскай хаце? Таго ж нацярпелася і наша матухна-зямля. Досыць! Ды не пагадзіліся блудныя дзеці. І пайшлі у мяцежны разнос. І зноў роднай зямлі — слёзы. Таму і насамрэч запасы каменнай солі ў краіне невычэрпныя.

У савецкія часы добрыя фільмы здымалі. Павучальныя. «Зорны хлопчык», напрыклад. Ён быў спрытны і разумны, але жорсткі і халодны. Нават сваю маці ў лахманах жабрачкі адштурхнуў і пакрыўдзіў. Але лёс даў яму шанц выправіць памылкі... Гэта казка. А рэчаіснасць горшая.

Сваю маці-краіну, нібыта тыя падлеткі, мы саромеемся. Сапраўды так і паводзім сябе. Саромеемся Беларусі, Гісторыі, Перамогі. Абы не было вайны. Скажыце гэта цяпер, гледзячы ў вочы бежанцам з майданутай Украіны.

А як мы, бывае, саромеемся сваёй роднай зямелькі ў літаральным сэнсе... Калі гэта слова «калгаснік» стала абразлівым? Як толькі стала абразлівым, тады і з'явіліся харчовыя цягнікі. Як толькі стала абразлівым, тады ўся інтэлігенцыя стала ў чаргу. З аднаго боку — тыя, хто паляваў на «джынсу», з другога — тыя, хто гандляваў «з-пад крыса».

Цікава, а што цяпер адкажуць тыя, кто крытыкаваў Лукашэнку за тое, што ён, маўляў, грошы ў зямлю закопвае? Маўляў, з Польшчы танней было б вазіць. Беларускія каўбасы і сыры і раней былі брэндам нашай адкрытай экспартаарыентаванай эканомікі. А ў надыходзячы харчовы крызіс — гэта ўжо стратэгічная нацыянальная небяспека.

А колькі вэрхалу нарабіла аграрная палітыка Лукашэнкі! Пра вёску самыя прасунутыя «эксперты» згадваюць, калі выязджаюць на адпачынак з шашлыком. Вельмі лёгка заўзята крытыкаваць аграрную палітыку, аплятаючы айчынную вяндліну. І чарка ды шкварка, аказваецца, — не так ужо і дрэнна.

Ну што, і далей будзем саромецца тавараў, створаных намі ж? Нашыя камізэлькі і лепшыя, і натуральныя. Не, мы ўпіхваемся ў замежнае адзенне, як у тую пятлю, і душымся ім. За адзін надпіс па-англійску. То ж модна так. Добра, адзенне для цела. Але мы ж і душы свае, і розум у іншаземныя анучы хаваем. І палітыка тут ні да чаго. Тут сапраўдная здрада беларускасці.

Аднаго не магу зразумець. Чаму беларускасць некаторыя «светачы» нацыі атаясамліваюць менавіта з «эўрапейскасцю». Ад «эўрапейскасці» смярдзіць садомскім брудам. Хопіць пэцкаць светлую і чыстую Беларусь! Мы ж для «эўрапейцаў» былі заўжды тутэйшымі. Халопамі. І цяпер яны чакаюць нас. Няма там каму спіны гнуць. Там усе заняліся абаронай самых талерантных гендараў.

Мы пакуль адстаём. Славяне — унтэрменш — трэці сорт, што зробіш. Мы пакуль затрымаліся на ніжэйшай ступені піраміды «новых нармальнасцяў» — мы ў палоне філасофіі вантробы.

Калі мы сталі такімі? Сквапнымі. Нашы продкі нават сярод галечы і нястачы «паспалітых» перыядаў альбо пасля ваеннага ліхалецця ўмелі радавацца сонцу і вясне. Раней залежалі ад зямлі. Ад цяжкай працы. Але ж і святы ладзілі. Земляробчы каляндар быў знітаваны з побытавым. Бо зямля была насамрэч роднай.

А калі паглядзець хроніку пасляваеннага будаўніцтва, то на кадрах — сапраўды светлыя летуценнікі. А аб чым цяпер мы марым? Аб новым гаджэце ці дзесяці тысячах «падпісоты» ў «Цік-Току». Бо за тое грошы даюць. Грамадства спажывання...

Кажуць, Бог размаўляе з чалавекам шэптам любові, голасам сумлення, а потым ужо — рупарам выпрабаванняў. Мо зробім гэтую іншаземную "тын-дынц" цішэйшай. Хопіць хварэць на падлеткавую хваробу — манкуртам досыць ужо скакаць пад заморскія матывы на рэйв-вечарынках. Час ужо змываць з твару касметыку чужых сэнсаў, а то некаторыя ўжо і забыліся, як насамрэч выглядаюць. Нас чакаюць сур'ёзныя справы. Трэба дапамагчы бацьку. Вясна на родным полі — час сяўбы.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Акуловіч Ірыне Барысаўне, генеральнаму дырэктару рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускае тэлеграфнае агенцтва», у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне генеральнаму дырэктару рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускае тэлеграфнае агенцтва» Акуловіч Ірыне Барысаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам – смерцю МАЦІ.**

**Супрацоўнікі РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказваюць глыбокія спачуванні Акуловіч Ірыне Барысаўне, генеральнаму дырэктару рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускае тэлеграфнае агенцтва», у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# УРОК НАШАЙ ПРАЎДЫ

## Навучэнцы каледжаў і школьнікі сталіцы даведаліся пра Вялікую Айчынную вайну тое, аб чым не напісана ў падручніках па гісторыі

**Своеасаблівы ўрок памяці і праўды аб найбольш трагічным перыядзе ў нашай гісторыі адбыўся ў сімвалічным месцы — у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Лейтматывам сустрэчы з моладдзю, арганізаванай па ініцыятыве ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама, стала тэма генацыду беларускага народа ў гады ваеннага ліхалецця.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК** ашаламіў прысутных малавядомымі фактамі аб тых злачынствах, якія падчас акупацыі здзяйснялі на нашай зямлі фашысты і іх памагатыя. Прычым рэзанансныя рэчы, якія пацвярджаюць факт генацыду беларускага народа, парламентарый, ён жа доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук, агучыў, цытуючы нямецкіх і брытанскіх гісторыкаў. Ім, як пажартаваў дэпутат, заробак у Беларусі не плацяць, а гэта значыць толькі тое, што гэтыя замежныя даследчыкі, якія з'яўляюцца сур'ёзнымі сусветнымі спецыялістамі ў тэме Другой сусветнай вайны, сведчаць праўду, пра якую так не хочуць гаварыць іх заходнія калегі.

— Генацыд беларускага народа — гэта не фэйк, выдуманы ўладай і Генеральнай пракуратурай нашай краіны, — падкрэсліў Ігар Марзалюк. — Генацыд у Беларусі быў шматслойны. Гэта і Халакост, масавае вынішчэнне яўрэяў. Немцы выдатна ведалі ўсе нацыянальныя канфлікты, якія адбываліся на нашай тэрыторыі, і ўмелі выкарыстоўваць іх у сваіх мэтах. У выніку латышскія нацыяналісты вынішчалі Віцебшчыну, Армія Краёва праводзіла зачыстку на тэрыторыі Заходняй Беларусі, літоўскія падраздзяленні разам з украінскімі нацыяналістамі выпальвалі вёскі па ўсёй тэрыторыі нашай краіны. Нас знішчаў нацысцкі інтэрнацыянал.

Падчас сустрэчы з моладдзю **пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства ўпраўлення Следчага камітэта па Мінску Алена ЛУЖЫНСКАЯ** расказала аб ходзе расследавання крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. «Распачатая крымінальная справа перш за ўсё накіраваная на ўстанаўленне канкрэтных асоб з ліку нямецкіх захопнікаў і іх памагатых, якім удалося пазбегнуць пакарання за забойства мірных жыхароў, за здзекі, катаванні ў гета, масавы згон грамадзянскага насельніцтва ў нямецкае рабства, — нагадала пракурор. — Толькі ў Мінску дапытана каля тысячы сведак. Большасць з іх — гэта вязні фашысцкіх канцлагераў. Усяго па краіне ў допыце ўзяло ўдзел больш чым 13 тысяч сведак. За перыяд следства пракуратурай Мінска ў архіўных установах Беларусі праведзена звыш 900 аглядаў, у ходзе якіх знойдзены архіўныя дакументы, што сведчаць аб фактах масавага знішчэння грамадзянскага насельніцтва і згоне ў рабства».

— Трагедыя Хатыні, а таксама тысяч вёсак і гарадоў Беларусі — несуцішны боль кожнага грамадзяніна нашай краіны, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА.** — Вось ужо 77 гадоў як скончылася вайна, але мы кожны дзень кажам аб тым, як у той складаны час выжывалі людзі. Мы сёння звяртаем увагу на тое, што ў нас Год гістарычнай памяці, але ў нас і Год гістарычнай праўды. Мы павінны данесці яе да кожнага дзіцяці, кожнага беларуса, які не ведае аб тым, хто выяваў у час Вялікай Айчыннай вайны і хто абараняў нашу беларускую зямлю.

На сустрэчу з моладдзю была запрошана і **вязень канцлагера «Азарычы», старшыня савета старэйшын Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза жанчын Надзея ЛОСЬ.** Да сёння ў яе памяці — вайна, а таксама тыя здзекі, якія ўчынілі на беларускай зямлі і над яе народам фашысты. У «Азарычы» яна трапіла шасцігадовай дзяўчынкай. «Лагер знаходзіўся за восем кіламетраў ад маёй вёскі, — расказвае Надзея Лось. — У 1941 годзе немцы прыйшлі туды як гаспадары. Нашу сям'ю, маці і траіх дзяцей, выгналі з хаты, у якой пасяліўся нямецкі генерал. Нам забаранілі нават сюды падыходзіць. Добра, што гэта было летам, і мы мелі магчымасць прыгатаваць хоць якую-небудзь ежу на вогнішчы. У 1944 годзе жыхароў нашай вёскі, у асноўным старых і дзяцей, вывелі на шырокую дарогу. Паставілі ў шарэнгі, каля нас ішлі жандары з сабакамі: яны сачылі за тым, каб людзі не адставалі ад калоны. Тых, хто не мог ісці, адразу застрэльвалі. Мне запомнілася, што я моцна ўхапілася за руку сваёй сястры і імкнулася не адстаць, хоць трэба было ісці восем кіламетраў». Як прызнаецца жанчына, звычка трымаць кагосьці за руку — дачку, пасля ўнука — у яе засталася на ўсё жыццё.

«Канцлагер «Азарычы» быў акружаны калючым дротам, — успамінае былая вязніца. — З аднаго боку ад яго знаходзілася балота, з іншых — лес і дарога. Каля агароджы з калючага дроту былі выкапаны рвы. У нас забралі ўсе пажыткі, якія былі з сабой, і сказалі легчы на замёрзлую зямлю. Быў сакавік. Ноччу — мінусавая тэмпература, днём прыгравала сонца. Днём мы стаялі па калена ў вадзе ў балоце, а ноччу ператвараліся ў ледзяныя скульптуры. Пітной вады не было. Людзі пачалі паміраць. Мне запомнілася, як маленькая дзяўчынка прасіла ў маці папіць, не разумеючы таго, што яе маці памерла. Трупы не прыбіралі. Мёртвыя ляжалі побач з жывымі. Акрамя таго, што не было ежы і вады, фашысты заразілі нас сыпным тыфам. Мы выжылі толькі таму, што знаходзіліся ў лагеры параўнальна нядоўга, нас вызвалілі савецкія салдаты».

Гэты аповед жанчыны моцна ўразіў маладых слухачоў. Перад новым пакаленнем беларусаў стаяў чалавек, які ўсё бачыў на сваё вочы, які на сабе зведаў, што такое генацыд.

**Вераніка КАНЮТА.**

Год гістарычнай памяці

# ЗАРОНАВА ПОМНІЦЬ!

**У студзені на воінскі мемарыял у вёску Заронава Віцебскага раёна прыехалі родныя пахаванага тут воіна Івана Быкава. Яны шукалі месца яго апошняга прытулку больш чым 70 гадоў.**



Людміла НІКІЦІНА і юны экскурсавод Лізавета СЕМЕНЧУКОВА.

Баец Чырвонай Арміі Быкаў загінуў у баі каля вёскі Сываратка Заронаўскага сельсавета. Яго пляменнік Уладзімір разам з сям'ёй доўга шукаў месца, дзе пахаваны дзядзька. Шматлікія запыты прывялі ў абласны архіў Віцебска, адтуль — у Заронава. Захавальнік музейных каштоўнасцяў комплекснага музея «Гісторыя Заронаўскага краю», вядомы ў раёне пошукавік Людміла Нікіціна адразу дала адказ: Іван Андрэевіч Быкаў пахаваны на заронаўскім мемарыяле, яго імя занесена ў мясцовую кнігу памяці герояў-вызваліцеляў і ўвекавечана на пліце. Блізкія доўга чакалі, калі ў нялёгкай эпідэмічнай сітуацыі можна будзе наведаць Беларусь. Нарэшце ў студзені Быкавы прыехалі ў Заронава з Новасібірска, каб пакланіцца зямельцы, дзе знайшоў вечны спачын іх воін. У вачах стаялі слёзы радасці і невымоўнай падзякі за тое, як у вёсцы берагуць і шануюць памяць байцоў, якія склалі галовы за наша мірнае жыццё. Гэта толькі адна з некалькіх соцень такіх гісторый, што захоўвае Людміла Канстанцінаўна.

З канца 1943-га да чэрвеня 1944 года на тэрыторыі сельсавета вяліся жорсткія баі пры вызваленні горада Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сем месяцаў на гэтай тэрыторыі стаяў фронт. Страты былі велізарныя, аб гэтым сведчыць факт, што пасля вайны ў ваколіцах Заронава было 477 брацкіх пахаванняў. Пастановай ад 28 ліпеня 1945 года «Аб добраўпарадкаванні захаванняў загінулых воінаў Чырвонай Арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і перанясенні адзіночных магіл у цэнтры саўгасаў» было вырашана перанесці астанкі байцоў з найбліжэйшых вёсак у Заронава. У 1980 годзе па ініцыятыве былога дырэктара саўгаса В. Маладзечкіна і дачкі загінулага тут воіна В. Ламаносавай быў створаны воінскі мемарыял. Тады, 42 гады назад, былі вядомы толькі 4652 прозвішчы байцоў. Сёння, дзякуючы пошукавай працы музейнага савета, вернуты з небыцця 10 566 імёнаў. І гэта — не палова, нават не чвэрць з агульнай колькасці воінаў, якія навечна засталіся на заронаўскай зямлі.

Да стварэння музея ў 1986 годзе перапіску з роднымі і пошук вялі настаўнікі і вучні Заронаўскай школы, у 1984-м справу пераняла Людміла Нікіціна. Выхаваныя на патрыятызме дзеці апантана дапамагалі музею: ездзілі ў Падольскі архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі адпрацоўваць спісы байцоў, якія зніклі без вестак на тэрыторыі Заронаўскага сельсавета, падымалі астанкі салдат разам з пошукаўцамі з іншых краін у рамках Вахты Памяці. Заронаўскі мемарыял з'яўляецца другім па велічыні ў Віцебскім раёне, сюды няспынна ў любую пару года едуць унукі і праўнукі герояў, пахаваных тут.

Пошукавай дзейнасцю Людміла Нікіціна разам з сынам Станіславам і музейным актывам займаецца сёння ў складзе пошукавага атрада «Разведчыкі воінскай славы», які аб'ядноўвае энтузіястаў Віцебшчыны. Працуюць з матэрыяламі ваенна-гістарычных сайтаў. У 2009 годзе з дапамогай унукаў загінулых воінаў і абласнога савета ветэранаў музей выдаў унікальную кнігу памяці «Успомнім усіх паіменна», у якую занесены прозвішчы 8082 байцоў, увекавечаных на той час на мемарыяле. Разам з 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам УС Беларусі, Міжнародный пошукавай асацыяцыяй і Маскоўскай абласной грамадскай арганізацыяй «Дабрачынны ваенна-гістарычны клуб «Памяць і прымірэнне» правялі чатыры Вахты Памяці на тэрыторыі Заронаўскага с/с. Вынікам апошняй стала ўрачыста-жалобная цырымонія перапахавання астанкаў 83 байцоў Чырвонай Арміі ў верасні 2021 года, яно на мемарыяле ўжо дванаццатае. На заронаўскай зямлі падчас ваенных ліхалеццяў палеглі не толькі беларусы: у радах Чырвонай Арміі служылі ўсе нацыянальнасці былога Савецкага Саюза — казахі, расіяне, таджыкі... А ў 2020 годзе нарэшце знайшліся родныя воіна Ван Дзян-Чына — адзінага прадстаўніка Кітайскай Народнай Рэспублікі. Яго імя заўсёды выбівалася сярод іншых, музей актыўна шукаў родных воіна... І яны знайшліся з дапамогай сюжэта на тэлебачанні ў самім Хабараўску.

Воінскі мемарыял уяўляе сабой архітэктурны ансамбль: больш за 40 гадоў пазіраюць зверху на мірнае жыццё барэльефы танкіста, пехацінца і лётчыка, застылыя ў бетоне, побач з імі — сцяна памяці. У цэнтры мемарыяла — брацкая магіла, у якой пахавана больш за 4000 байцоў, уздоўж мемарыяльных пліт — такія ж пахаванні. Вясной, асабліва на Дзень Перамогі, на іх расцвітаюць ярка-чырвоныя цюльпаны. Мясцовыя жыхары кажуць, што гэта душы загінулых байцоў, якія зверху, як і жураўлі, берагуць кожнага з нас. У 2015 годзе на мемарыяле была ўсталявана мармуровая дошка з прозвішчамі 99 лётчыкаў 3-й паветранай арміі. Да 75-годдзя Перамогі нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне на брацкім пахаванні быў устаноўлены помнік, прысвечаны мясцовым ветэранам і воінам, што не вярнуліся з вайны. Калісьці, у сярэдзіне 2000-х, на 9 Мая тут яшчэ збіраліся ветэраны, успаміналі подзвігі і прымалі бясконцыя падзякі ад моладзі. На жаль, сёння яны ўсе пайшлі з жыцця. Помнік уяўляе сабой разгорнутую кнігу, вышэйшую за чалавечы рост, на старонках якой залатымі літарамі выбіты імёны. Дадаткам да помніка мясцовым жыхарам стала кніга Людмілы Нікіцінай «Заронава помніць», у якой распавядаецца пра жыццёвы шлях і ўзнагароды кожнага мясцовага жыхара, чыё прозвішча навечна ўпісана ў гісторыю сельсавета. Сёння пры фінансавай дапамозе Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага райвыканкама на заронаўскім мемарыяле ідуць рамонтныя работы: зроблены новыя тумбы, старыя дошкі з прозвішчамі салдат будуць заменены на мармуровыя.

Музей «Гісторыя Заронаўскага краю» і сельвыканкам рэалізоўваюць буйны праект па аднаўленні ўсіх брацкіх пахаванняў на іх тэрыторыі. Сумеснымі намаганнямі ўжо абнавілі чатыры помнікі ў ваколіцах Заронава. Апошні з іх — помнік двум разведчыкам у Суйкава, імёны якіх больш за 50 гадоў былі невядомы.

Вялікая грамадзянска-патрыятычная работа вядзецца ў музеі з юнымі мясцовымі экскурсаводамі. Вельмі ўплываюць на дзіцячы светапогляд сустрэчы з роднымі загінулых байцоў. У музейным комплексе берагуць і захоўваюць памяць пра многіх байцоў: Васілька Крылова — адзінага сыночка ў маці, які прыпісаў сабе лішні год, каб пайсці на фронт, і навечна застаўся на заронаўскай зямлі. Пра Андрэя Іванавіча Усатага, імя якога было на абеліску ў вёсцы Тапорына (лічыўся забітым). Ён знаходзіўся ў канцлагеры, дзе яму ампутавалі абедзве нагі, а ён знайшоў сілы жыць. Пра сям'ю Залескіх з вёскі Варанова, у якой на барацьбу з фашыстамі сталі бацька, маці і шасцёра дзяўчат. Такіх гісторый тут захоўваецца шмат — на кожнага байца сабрана папка з архіўнымі звесткамі, а з пантэона памяці глядзяць сотні пар вачэй, якія навечна знайшлі прытулак тут, у Заронаве.

Знакава, што ў Год гістарычнай памяці аднавілася транспартнае паведамленне Беларусі з Расіяй. Гэта значыць, што ўдзячныя праўнукі змогуць наведаць магілы герояў, каб пакланніцца ім.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# БУДУЧЫНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ТУТ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На працягу трох тыдняў у дзесяцікласнікаў — навучэнцаў профільных класаў — была магчымасць не толькі аздаравіцца, але і паглыбіцца ў свет педагагічнай прафесіі, будучы актыўнымі ўдзельнікамі розных прафарыентацыйных мерапрыемстваў. Ініцыятарам гэтай змены стаў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, які на працягу апошніх гадоў вядзе сістэмную работу па павышэнні іміджу прафесіі педагога і прыцягненні на педагагічныя спецыяльнасці акадэмічна паспяховых і матываваных абітурыентаў. Тут цудоўна разумеюць: ад таго, наколькі атрымаецца зацікавіць, захапіць, «зачапіць» 16-гадовых старшакласнікаў, залежыць выбар мінскімі школьнікамі педагагічнай прафесіі, а таксама выніковасць прыёмнай кампаніі.

## Працаваць кропкава

— Сталіца раней адставала ад іншых рэгіёнаў у адкрыцці педагагічных класаў, але ў апошні час сітуацыя змянілася, — канстатуе Аляксандр Жук. — Сёння Мінск ужо на другім месцы па колькасці такіх класаў і навучэнцаў. Вядома, у сталіцы ў выпускнікоў шмат «спакус», тут вялікі выбар навучальных устаноў і спецыяльнасцяў. Але я ўпэўнены, што ва ўзаемадзеянні ўніверсітэта і мінскіх школ у нас атрымаецца ліквідаваць дэфіцыт педагагічных кадраў, што ўтвараўся ў сталічных установах адукацыі. Трэба працаваць кропкава — і са школьнікамі, і з іх бацькамі. Трэба тлумачыць ім плюсы педагагічнай прафесіі: стабільны заробак, добрыя ўмовы працы, гарантаваны працяглы водпуск у летні час і г. д.

У праграме профільнай змены было 18 займальных адукацыйных мерапрыемстваў прафарыентацыйнай накіраванасці ад факультэтаў, інстытутаў і структурных падраздзяленняў БДПУ (ролевыя гульні, трэнінгі, майстар-класы, акцыі, прэзентацыі, навучальныя гульні, прафарыентацыйная гульнятэка, тэматычная лабараторыя і інш.). Але, напэўна, самымі запамінальнымі сталі візіт у галоўны педагагічны ўніверсітэт краіны і сустрэча з яго кіраўніцтвам. Для падлеткаў была арганізавана экскурсія па шасці маршрутах, якую правялі гіды — студэнты гістарычнага факультэта. Госці пабывалі ў інтэрактыўным музеі, дзе даведаліся гісторыю станаўлення педагагічнай адукацыі ў Беларусі, наведалі Залу рэдкай кнігі, мастацкую галерэю «Асветнікі зямлі беларускай», рэсурсны цэнтр адукацыйнай робататэхнікі, ім паказалі спартыўную залу і басейн, а таксама ўніверсітэцкую славутасць — маятнік Фуко.



Экскурсаводамі для навучэнцаў педагагічных класаў сталі студэнты гістарычнага факультэта.

А затым адбылася шчырая гутарка з рэктарам, прафесарам Аляксандрам Жуком: пра асаблівасці педагагічнай прафесіі, місію настаўнікаў і важнасць правільнага выбару.

## «Ці магу я? Ці хачу я?»

— Футуролагі кажуць, што ў сярэдзіне XXI стагоддзя застануцца тры асноўныя прафесіі — настаўнік, урач і айцішнік. Але на першым месцы ўсё роўна стаіць настаўнік, бо ўсё пачынаецца менавіта з яго. І крэда нашага ўніверсітэта — «Будучыня пачынаецца тут!» Нездарма перад уваходам у галоўны корпус мы ўстанавілі да 100-годдзя ўніверсітэта скульптуру, прысвечаную першай настаўніцы. Ні ў адной сталіцы свету на галоўнай плошчы вы не ўбачыце такі сімвал павагі да настаўніцкай прафесіі, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Усе рэспубліканскія экскурсіі і экскурсіі для замежных гасцей абавязкова спыняюцца, фатаграфуюцца з нашай настаўніцай і вязуць затым гэтыя фота дамоў. Місія і роля настаўніка выключна важныя для будучыні краіны. Разумеючы гэта, мы і пачалі ствараць сістэму педагагічных класаў, каб на педагагічныя спецыяльнасці прыходзілі прафесійна матываваныя абітурыенты. Быць настаўнікам — адна з найскладанейшых задач, і добра, калі ў старшакласнікаў яшчэ ў школе ёсць магчымасць праверыць правільнасць свайго выбару. Не канстатаваць на трэцім-чацвёртым курсе, што ты памыліўся, а каштоўны час ужо страчаны, а пераканацца ў сваіх здольнасцях і схільнасцях яшчэ падчас першых педагагічных спроб, здзейсненых у школе. Калісьці мы пачыналі са 100 класаў, а цяпер у нас па краіне іх ужо 556. У профільных класах навучаюцца 5100 чалавек, і 30 працэнтаў з іх паступаюць пасля заканчэння школы на педагагічныя спецыяльнасці.

Трэцяя частка ад агульнай колькасці: многа гэта ці мала? Я лічу, што нядрэнная лічба, таму што ў вас ёсць магчымасць прымераць на сябе патрабаванні да педагагічнай прафесіі і зразумець, ваша гэта ці не? Да таго ж і педсавет у школе не кожнаму дасць рэкамендацыю для паступлення, таму што не кожны выдатнік можа стаць добрым педагогам. Я ў гэтым абсалютна перакананы. Трэба ставіць перад сабой пытанні і шчыра на іх адказваць. Ці магу я? Ці хачу я? Педагогіка — гэта пакліканне. Зразумела, кожны настаўнік павінен валодаць прадметам, які выкладае, але гэтага недастаткова. Сутнасць нашай прафесіі — не проста ў трансляцыі ведаў. Гэта высокая місія і гатоўнасць вучыцца ўсё жыццё разам з дзецьмі і ў дзяцей.

Самае складанае — быць сумленным і шчырым перад сваімі вучнямі, таму што дзеці вельмі добра адчуваюць фальш.

Трэба прымаць кожнага вучня такім, які ён ёсць, зразумець прычыны яго паводзін, знайсці да яго падыход. Гэта не работа на канвееры, а штодзённая работа з людзьмі. Падчас вывучэння факультатыву «Уводзіны ў педагагічную прафесію» вы можаце зразумець, наколькі блізкая вам прафесія педагога. **Матывацыя — гэта, напэўна, самае важнае. А педагагічныя класы — наш падмурак.** Сёння ў БДПУ навучаюцца 750 выпускнікоў профільных класаў.

## Любыя мэты — дасягальныя!

**«А як стаць рэктарам? Што самае цяжкае ў вашай рабоце? І якімі дасягненнямі вы ганарыцеся?»** — пацікавіліся школьнікі ў Аляксандра Жука.

— Шчыра кажучы, у маладосці я такіх задач перад сабой не ставіў, — усміхнуўся рэктар. — І хоць вучыўся вельмі добра (асабліва захапляла мяне матэматыка), да пэўнага часу ў мяне былі праблемы з паводзінамі, было шмат заўваг. Але затым прыйшло разуменне: калі нешта робіш, то трэба рабіць гэта добра. Спорт заўсёды прысутнічаў у маім жыцці: я займаўся гімнастыкай, барацьбой, гульнявымі відамі, веласпортам. Пры гэтым быў выдатнікам і школу скончыў з залатым медалём. На ўроках максімальна ўключаўся ў работу, нават паспяваў у класе выканаць дамашняе заданне, таму ў мяне і заставаўся час на занятки спортам.

> **«Самае складанае — быць сумленным і шчырым перад сваімі вучнямі, таму што дзеці вельмі добра адчуваюць фальш».**

Затым была вучоба на механіка-матэматычным факультэце БДУ, дзе я быў старастам групы, камандзірам і камісарам будатрада. У аспірантуры падрыхтаваў кандыдацкую не за тры гады, а за два. Потым ствараў Ліцэй БДУ. Гэта быў вельмі цікавы час, калі ўсё рабілася з нуля. Не было ні будынка для ліцэя, ні настаўнікаў, ні навучэнцаў... Мы пачыналі з фізіка-матэматычнага профілю. А сёння гэта самая паспяховая навучальная ўстанова ў краіне.

Потым сем гадоў быў рэктарам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі (цяпер гэта Акадэмія паслядыпломнай адукацыі). Абараніў доктарскую. Нядоўга папрацаваў першым прарэктарам БДУ, потым амаль 13 гадоў быў першым намеснікам міністра адукацыі. А ў 2014 годзе прыйшоў у БДПУ, добра ведаючы ўсю сістэму, усе яе ўзроўні і разумеючы, якім павінен быць сучасны педагог. Мяркую, складана ў школьныя гады марыць стаць рэктарам ці намеснікам міністра, але я ўпэўнены, што любыя мэты дасягальныя. **Трэба толькі працаваць якасна і адказна. І сёння, і заўтра будзе цаніцца прафесіяналізм, таму, чым бы вы ні займаліся, рабіце ўсё так, каб вам не было сорамна.** А калі чалавек слаба падрыхтаваны, то на рабочым месцы гэта вельмі хутка становіцца зразумелым.

На пасадзе рэктара адным з галоўных сваіх дасягненняў Аляксандр Жук лічыць стварэнне сістэмы педагагічных класаў і кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі:

— Наш вопыт вывучаўся расійскімі калегамі, і сёлета ў Расіі адкрыліся ўжо 5 тысяч педагагічных класаў. Іх таксама цікавіць вопыт дзяржаўнай падтрымкі выпускнікоў педкласаў у плане выдзялення ім пэўных ільгот пры паступленні. Нас калісьці папракалі, што мы ствараем «пралаз» для слабых абітурыентаў. Але мы даказалі, што такія абвінавачванні не маюць ніякіх падстаў. Гэта даказваюць і



У праграме экскурсіі было наведванне Залы рэдкай кнігі.

вынікі экзаменацыйных сесій. Да таго ж, першыя выпускнікі педкласаў ужо скончылі педуніверсітэт і сёння паспяхова працуюць ва ўстановах адукацыі. А педкласы сталі падмуркам для кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі, асноўная мэта якога — аб'яднанне вучэбна-навукова-інавацыйнага патэнцыялу адукацыйных і навукова-метадычных устаноў. Больш за тое, сёння мы ўжо ў эксперыментальным рэжыме апрабоўваем і мадэль дапрофільнай педагагічнай адукацыі, пачынаючы з пятага класа. Хацелася б, каб на старшай ступені школы ў профільныя класы таксама прыходзілі матываваныя вучні.

Важным дасягненнем Аляксандр Жук лічыць і прызнанне БДПУ базавай арганізацыяй па інклюзіўнай адукацыі. Па выніках 2018 года ўніверсітэт атрымаў прэмію ўрада ў вобласці якасці. А яшчэ БДПУ — адзіная з беларускіх ВНУ, якая была адзначана Прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Так высока былі ацэнены яе заслугі па развіцці сярод студэнцтва валанцёрскага руху. У БДПУ ім ахоплены 1600 чалавек, за год праводзіцца прыкладана чатыры сотні валанцёрскіх акцый і мерапрыемстваў.

## Прафілізацыя па запыце

Адказваючы на пытанне пра магчымасць пашырэння спецыяльнасцяў, Аляксандр Жук растлумачыў, што сёння падрыхтоўка ва ўніверсітэце вядзецца па ўсіх запатрабаваных спецыяльнасцях — ад выхавацеляў да настаўнікаў-прадметнікаў, сацыяльных педагогаў і практычных псіхолагаў. Але адукацыйная сфера павінна рэагаваць на запыты часу і трымаць руку на пульсе. «Хутчэй, трэба развіваць не аб новых прафесіях, а аб новых педагагічных ролях, — падкрэсліў ён. — Некалькі гадоў таму расійскае Агенцтва стратэгічных ініцыятыў сумесна з Фондам «Сколкава» распрацавала «Атлас прафесій будучыні». Што датычыцца сферы адукацыі, то там згадвалася, што ў перспектыве будуць запатрабаваныя цьютары, медыятары, распрацоўшчыкі электронных адукацыйных рэсурсаў, арганізатары праектнага навучання і гэтак далей. Зрэшты, гэта ўжо частка нашых рэалій. Змяняецца сам працэс навучання: мы ўсё больш выкарыстоўваем у рабоце IT-інструменты. Але я глыбока перакананы, што ніколі камп'ютар або штучны інтэлект не заменяць жывых стасункаў з педагогам. І як бы ні называлі спецыяліста — цьютарам, арганізатарам, камунікатарам, усё роўна педагагічны складнік у яго рабоце — галоўны. Таму мы не фармулюем цяпер новыя спецыяльнасці. З прыняццем новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі прадугледжваецца інавацыйны падыход, звязаны з прафілізацыяй. Мы працягнем рыхтаваць педагогаў, але за кошт дадатковых факультатываў і курсаў па выбары студэнт сам будзе ажыццяўляць сваю спецыялізацыю. Напрыклад, будучы настаўнік матэматыкі і фізікі зможа выбраць курсы па робататэхніцы (у нас дзейнічае Рэспубліканскі рэсурсны цэнтр адукацыйнай робататэхнікі), а затым выкладаць яе дзецям ва ўстанове адукацыі.

**«А як вы паставіцеся, калі студэнт на апошніх курсах захоча сумяшчаць вучобу з работай?»** — пацікавіліся школьнікі ў рэктара.

— Працуючы студэнт — гэта ўжо звычайная практыка. Калі малады чалавек працаўладкоўваецца па спецыяльнасці на старшых курсах, мы гэта толькі вітаем. Але трэба разумець, што галоўны абавязак маладых людзей — усё ж такі вучоба. Калі сярэдні бал іх паспяховасці не ніжэйшы за 7, мы не перашкаджаем працоўнай занятасці. У нас ёсць магчымасць індывідуальнай формы навучання, так званага вольнага наведвання. Для маладога чалавека зацвярджаецца навучальны план, даецца магчымасць праходжання педагагічнай практыкі па месцы работы, — адзначыў рэктар. — Дыпломныя і курсавыя работы, якія пішуць студэнты, могуць быць выкананыя па заказе ўстаноў адукацыі і мець практыка-арыентаваны характар. Напрыклад, будучаму педагогу школа, у якой ён падпрацоўвае, можа прапанаваць стварыць электронны рэсурс. Гэта добрае сумяшчэнне тэорыі і практыкі.

Дарэчы, з наступнага года ўвойдуць у сілу нормы аб павелічэнні працэнта бюджэтных месцаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Для педагагічных спецыяльнасцяў пад мэтавую падрыхтоўку можа адводзіцца да 60 працэнтаў ад іх агульнай колькасці. Пры гэтым такая падрыхтоўка будзе магчымая для арганізацый, размешчаных у буйных населеных пунктах, у тым ліку і ў сталіцы. На думку Аляксандра Жука, павелічэнне мэтавага набору — ідэя нядрэнная. Хлопцы і дзяўчаты будуць прыходзіць у ВНУ і пры гэтым адразу ведаць, дзе яны будуць працаваць на працягу пяці гадоў пасля атрымання дыплома. «Але мы будзем ставіць пытанне перад Міністэрствам адукацыі, камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама, каб мэтавыя накіраванні па нашым профілі выдаваліся найперш выпускнікам педагагічных класаў, — падкрэсліў ён. — Яны і цяпер, калі паступаюць на ўмовах сумоўя, ведаюць, што трэба будзе адпрацоўваць не два, а пяць гадоў. Таму мы лічым, што будзе правільным, калі менавіта выпускнікі профільных педагагічных класаў будуць разглядацца ў якасці прэтэндэнтаў на мэтавую падрыхтоўку ў першую чаргу».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*Поўны тэкст і фота на сайце zviazda.by.*

Организация:

# ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»

Учетный номер плательщика: 100103703
Вид экономической деятельности: розничная торговля
Организационно-правовая форма: частная
Единица измерения: тыс. руб.
г. Минск, ул. Варвашени, 50

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 31 декабря 2021 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2021 года | На 31 декабря 2020 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 5 771 | 4 932 |
| Нематериальные активы | 120 | 5 | 4 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 305 | 321 |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 305 | 321 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 38 | |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **6 119** | **5 257** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 3 086 | 2 717 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 341 | 282 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | 2 745 | 2 435 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 9 | 8 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 1 | 3 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 176 | 170 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1 238 | 1 271 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **4 510** | **4 169** |
| **БАЛАНС** | **300** | **10 629** | **9 426** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2021 года | На 31 декабря 2020 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 650 | 551 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | | |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 18 | 13 |
| Добавочный капитал | 450 | 3 867 | 3 229 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 1 562 | 1 494 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | - |
| Целевое финансирование | 480 | | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **6 097** | **5 287** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 4 | 3 |
| Доходы будущих периодов | 540 | | |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **4** | **3** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 4 528 | 4 136 |
| в том числе: | | - | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 4 094 | 3 763 |
| по авансам полученным | 632 | 30 | 25 |
| по налогам и сборам | 633 | 71 | 36 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 64 | 49 |
| по оплате труда | 635 | 253 | 251 |
| по лизинговым платежам | 636 | | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 13 | 10 |
| прочим кредиторам | 638 | 3 | 2 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **4 528** | **4 136** |
| **БАЛАНС** | **700** | **10 629** | **9 426** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за январь – декабрь 2021 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2021 года | За январь – декабрь 2020 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 46 937 | 46 993 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (36 742) | (36 789) |
| Валовая прибыль | 030 | 10 195 | 10 204 |
| Управленческие расходы | 040 | (1 652) | (1 586) |
| Расходы на реализацию | 050 | (8 897) | (8 654) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | (354) | (36) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 776 | 741 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (520) | (578) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (98) | 127 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 293 | 266 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 25 | 3 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | | - |
| проценты к получению | 103 | 104 | 103 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 164 | 160 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (95) | (46) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (19) | (15) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (76) | (31) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | - | - |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | | |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 198 | 220 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 100 | 347 |
| Налог на прибыль | 160 | (57) | (122) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (1) | |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | | |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (3) | (3) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 39 | 222 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | | |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 39 | 222 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

**Руководитель** **А.С. Вайтехович**
**Главный бухгалтер** **Г.Н. Сивец**
**29 марта 2022 г.**

## Отчетность ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» о дивидендах и акциях за 2021 год

Доля государства в уставном фонде эмитента (коммунальная): 91,7118 %.
Количество акционеров – всего 1096, в том числе: юридических лиц – 1, в том числе: физических лиц – 1095.
Начислено на выплату дивидендов: 91,4 тыс. руб.
Фактически выплаченные дивиденды: 91,4 тыс. руб.
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги): 0,06968 руб.
Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги): 0,06968 руб.
Период, за который выплачивались дивиденды: 2020 год.
Дата принятия решений о выплате дивидендов: 18.03.2021.
Сроки выплаты дивидендов: с 12.04.2021 по 28.05.2021.
Обеспеченность акции имуществом общества: 4,03 руб.
Количество акций, находящихся на балансе общества, – нет.
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг: 46937 тыс. руб.
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию: 47 291 тыс. руб.
Прибыль до налогообложения – всего: 100 тыс. руб.
В том числе: убыток от реализации продукции, товаров, работ, услуг: -354 тыс. руб.;
прочие доходы и расходы по текущей деятельности: 256 тыс. руб.;
прибыль от инвестиционной и финансовой деятельности: 198 тыс. руб.
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие платежи, исчисляемые из прибыли: 61 тыс. руб.
Чистая прибыль: 39 тыс. руб.
Нераспределенная прибыль: 1562 тыс. руб.
Долгосрочные обязательства: 4 тыс. руб.
Среднесписочная численность работающих: 437 человек.
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки: розничная торговля.
Дата проведения годового общего собрания акционеров за отчетный 2021 год: 30 марта 2022 года.
Эмитент применяет следующие правила корпоративного поведения: Корпоративный кодекс, Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг, Положение об аффилированных лицах и другие локальные правовые акты Общества.
Адрес официального сайта ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» в глобальной компьютерной сети Интернет: info@zrpt.by

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

Индивидуального предпринимателя Кашиной Ларисы Николаевны (Место нахождения: Республика Беларусь, 220107, г. Минск, ул. Народная, д. 18, кв. 52. Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом решением от 26.07.2007 № 1662, УНП 690108322) от 01.03.2022 по бухгалтерской отчетности ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» за 2021 год:

«По моему мнению, годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» по состоянию на 31 декабря 2021 года».

**Директор** **А.С. Вайтехович**
**Главный бухгалтер** **Г.Н. Сивец**
**Начальник экономического отдела** **Е.М. Казючиц**

## ИНФОРМАЦИЯ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождение акционерного общества | Открытое акционерное общество «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» 220137, г. Минск, ул. Варвашени, 50 |
| Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям | 30 марта 2022 года |
| Дивиденды, начисленные на одну акцию | Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги): 0,022461 руб. Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги): - |
| Срок и порядок выплаты дивидендов по акциям | С 18.04.2022 по 31.05.2022. - работающим акционерам – по отдельным ведомостям с перечислением на карт-счета; - неработающим акционерам – в кассе Общества, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Варвашени, 50, почтовым переводом по месту жительства или путем перечисления на счет в банке |

**Директор** **А.С. Вайтехович**
**Главный бухгалтер** **Г.Н. Сивец**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1:
- капитальное строение с инвентарным номером 421/С-1279, расположенное по адресу: Гродненская обл., Вороновский район, г. п. Радунь, ул. Советская, 44/2, бытовое помещение площадью 23,2 кв. м, целевое назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – бытовое помещение;
- капитальное строение с инвентарным номером 421/С-1278, расположенное по адресу: Гродненская обл., Вороновский район, г. п. Радунь, ул. Советская, д. 44, площадь 64,0 кв. м, назначение – здание административное, наименование – административное здание;
- капитальное строение с инвентарным номером 421/С-9330, расположенное по адресу: Гродненская обл., Вороновский район, г. п. Радунь, ул. Советская, 44/1, проходная, площадь – 10,5 кв. м, целевое назначение – здание административно-хозяйственное, наименование- проходная;
- капитальное строение с инвентарным номером 421/С-1280, расположенное по адресу: Гродненская обл., Вороновский район, г. п. Радунь, ул. Советская, д. 44, площадь – 225,0 кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж

Лот № 1 расположен на земельном участке: кадастровый номер 421356200002000129, находящемся по адресу: Гродненская обл., г. п. Радунь, ул. Советская, 44, площадь – 0,3684 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания производственных зданий и сооружений

Начальная цена продажи – 101 666 руб. (сто одна тысяча шестьсот шестьдесят шесть рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 10 166 руб. (десять тысяч сто шестьдесят шесть рублей)

Продавец – Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г. п. Вороново, ул. Калинина, 4, тел. 8-01594-217-83

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – 100 % предоплата. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 06 мая 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 208**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 04 мая 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 441/D-3070 (назначение – помещение общественного питания), площадь – 497,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, Юратишковский с/с, г.п. Юратишки, ул. Советская, 76-2.
ЛОТ № 1: расположен на земельном участке с кадастровым номером № 422955570001000647, находящемся по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, г. п. Юратишки, ул. Советская, 76, площадь 0,0788 га, назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (обслуживания магазина «Восточный» и закусочной).
Начальная цена продажи – 100 000 руб. (сто тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 10 000 руб. (десять тысяч рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Лидский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 19, тел. 8-0154-611381

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 06 мая 2022 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 04 мая 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**

В **суде Первомайского района г. Минска** находится заявление о признании умершей БОГУРСКОЙ (ПРИМАКО) Елены Александровны 28 декабря 1981 года рождения, уроженки г. Минска, которая проживала по адресу: г. Минск, ул. Калиновского, дом 33, кв. 43 до 2002 года. Просим граждан и юридических лиц, которым известно местонахождение Богурской Елены Александровны, сообщить сведения о ее местонахождении в суд Первомайского района г. Минска, ул. Ф. Скорины, 6Б, тел.: +375 (17) 289-48-06, +375 (17) 289-48-11, +375 (17) 289-48-13.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» **сообщает об отмене** продавцом аукциона, назначенного на 07.04.2022 в 11.00, по продаже имущества ОАО «МИНСККОНТРАКТ» (извещение в газете «Звязда» 22.03.2022).

УНП 190055182

# ЭЛЕКТРОННЫ КАБІНЕТ КАРЫСТАЛЬНІКА

## Нястрогая і строгая аўтэнтыфікацыя



Асабісты электронны кабінет практычна нічым не адрозніваецца ад іншых інтэрнэт-кабінетаў чалавека, лічаць спецыялісты. Практычна кожны з нас у штодзённым ужытку сутыкаецца з парталамі ды сайтамі розных паслуг, якія патрабуюць аўтарызацыі, рэгістрацыі і стварэння асабістага кабінета. Напрыклад, інтэрнэт-банкінг, е-дастаўка ці яшчэ нешта. Гэта трэба, каб паслугі аказваліся пэўнаму чалавеку, а не невядомай асобе, патлумачыла **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі НЦЭП:**

— Адзіны партал электронных паслуг — таксама вэб-сайт, на якім існуюць розныя спосабы аўтарызацыі і паняцце асабістага электроннага кабінета. Гэта месца, дзе карыстальнік у залежнасці ад спосабу сваёй аўтарызацыі можа атрымаць пэўныя паслугі.

Нястрогая аўтэнтыфікацыя, напрыклад, дазваляе аўтарызавацца на партале з выкарыстаннем акаўнту сацыяльнай сеткі. Пры гэтым карыстальніку будзе даступны мінімальны набор паслуг. Строгая аўтэнтыфікацыя адбываецца з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП) або ID-карткі і дае доступ да максімальнай колькасці сэрвісаў.

— Паслугі аказваюцца на падставе звестак з розных баз даных, якія інтэграваны з НЦЭП. Уладальнікі гэтых баз для абсалютнай большасці сэрвісаў патрабуюць менавіта строгай аўтэнтыфікацыі. Патрабаванні адносна ўсіх паслуг прапісваюцца ў дакументах паміж НЦЭП і ўладальнікамі баз. У іх абазначана, якія звесткі каму даступныя. Напрыклад, толькі адвакатам, натарыусам і дзяржорганам; толькі Адміністрацыі Прэзідэнта і абмежаванай колькасці дзяржарганізацый; усім без абмежаванняў. Умовы дыктуе менавіта ўладальнік баз даных, — падкрэсліла яна.

Раней, каб аўтарызавацца, фізічнай асобе трэба было ісці ў рэгістрацыйны цэнтр, плаціць грошы і атрымліваць флэшку з электронным лічбавым подпісам. У той жа час паслуг, для якіх патрабавалася строгая аўтарызацыя фізасобы, было няшмат, таму атрыманне флэшкі з ЭЛП не мела вялікага сэнсу, успамінае спецыяліст. Цяпер прасцей: ЭЛП аўтаматычна ёсць на ID-картцы кожнага, хто атрымаў новы пашпарт (такіх беларусаў звыш 52 тысячы). Імянныя сертыфікаты для лічбавага подпісу на ID-картцы выпускаюць якраз у цэнтры.

## Больш падзелішся — больш атрымаеш

У Цэнтры спадзяюцца, што з часам да АПЭП будзе далучацца ўсё больш аператараў баз даных, а людзі, адпаведна, змогуць атрымліваць больш паслуг. Для паспяховай і зручнай работы партала зараз не хапае многіх звестак ад трымальнікаў баз даных. Многія аператары зацікаўлены ў далучэнні да сістэмы, бо разумеюць, што яны, падзяліўшыся сваімі звесткамі, могуць атрымаць з партала інфармацыю, якая цікавіць іх, але якой яны не валодаюць. Аднак хапае і тых, хто не выказвае вялікага жадання, матывуючы сваю адмову фінансавымі, тэхнічнымі, арганізацыйнымі акалічнасцямі. Аднак найчасцей прычына ментальная, лічыць Святлана Караневіч:

— У свой час пэўныя базы даных распрацоўваліся за бюджэтныя сродкі для вырашэння пэўных праблем канкрэтнага ведамства. І многія з іх цяпер не хочуць дзяліцца назапашанымі за гады існавання звесткамі. Між тым у заканадаўстве сказана, што ўсе базы даных, якія ствараюцца зараз або мадэрнізуюцца, абавязкова павінны спалучацца з нашым парталам для аказання паслуг. У краіне ўжо ёсць падобны прыклад інтэграцыі, калі да сістэмы міжведамаснага электроннага дакументаабарота дзяржаўных органаў (СМДО) яшчэ ў 2013 годзе, згодна з Указам Прэзідэнта № 157, павінны былі далучыцца ўсе органы. Аднак толькі цяпер з ёй інтэгравалася больш за 90 % з іх.

Дарэчы, ці браць плату за выкарыстанне пэўнай інфармацыі з баз даных, вырашае сам іх уладальнік. Непасрэдна НЦЭП, напрыклад, як аператар агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы (ААІС), мае права аказваць бясплатна толькі тыя паслугі, для атрымання якіх ёсць нарматыўная падстава. І многія дзяржорганы, далучаючыся да АПЭП, мяняюць свае нарматыўныя дакументы, каб іх паслугамі можна было карыстацца бясплатна.

— Напрыклад, паслуга па рэгістрацыі іншаземцаў для гасцініц, аграэкасядзіб і грамадзян, якія здаюць жыллё ў арэнду. Прадстаўнікі ўсіх гэтых арганізацый абавязаны на працягу трох гадзін пасля рэгістрацыі замежніка (у любы час сутак) прынесці звесткі пра яго ў МУС. Цяпер гэта можна рабіць анлайн. Больш за тое, першыя паўгода гэтая паслуга была за грошы — цяпер стала бясплатнай, так што практыка змены нарматыўкі для забеспячэння людзям бясплатных паслуг рэальна існуе, — прыводзіла прыклад прадстаўніца НЦЭП.

## Спячы рэжым і «электронныя» плюсы

Са студзеня сёлета карыстальнікам на АПЭП даступна новая версія асабістага электроннага кабінета. У старым варыянце партала кабінет ствараўся па заяўным прынцыпе: арганізацыя, якая хацела атрымаць нейкую паслугу, дасылала ліст у НЦЭП, і, згодна з ёй, спецыялісты Цэнтра стваралі кабінет. Цяпер асабістыя кабінеты на падставе звестак з рэгістра насельніцтва створаны для ўсіх фізічных асоб.

— Першапачаткова яны неактыўныя, у спячым (неактыўным) рэжыме чакаюць, пакуль у іх увойдзе карыстальнік з выкарыстаннем строгай аўтарызацыі. Да акаўнта кабінета фізічнай асобы можна будзе прывязаць акаўнт юрыдычнай асобы. Калі грамадзянін Іван Іванавіч з'яўляецца ў тым ліку і кіраўніком арганізацыі, ён да свайго асабістага кабінета можа прывязаць і акаўнт юрасобы. І пасля шляхам змены ўліковага запісу ў рамках свайго электроннага кабінета ён зможа атрымліваць паслугі і як фізасоба, і як юрасоба, — распавяла Святлана Караневіч.

Асабісты электронны кабінет на АПЭП карысны яшчэ і тым, што праз яго можна заказаць усе паслугі, даступныя праз інтэрнэт. Чалавеку не трэба шукаць, на сайт якой арганізацыі звярнуцца, каб атрымаць патрэбныя звесткі. Тым больш што яшчэ не факт, што на сайце патрэбнага ведамства будзе рэалізавана магчымасць работы з ID-карткай для аказання пэўных дзяржпаслуг. Многія дагэтуль не падрыхтаваліся да такіх нававўядзенняў, хоць час ім быў дадзены, абазначыла спецыяліст:

— Кожныя два гады ААН публікуе рэйтынгі гатоўнасці краін да пераходу на электронны ўрад. І Беларусь мінулы раз (2020 год) значылася на 40-м месцы са 196 краін-удзельніц. У лідарах звычайна Карэя, Данія, Малдова, Вялікабрытанія. У абсалютнай большасці краін, дзе функцыянуе электронны ўрад і аказваюцца паслугі дзяржорганаў, прыйшлі да высновы, што пляцоўка для аказання дзяржсэрвісаў павінна быць адна.

## Як «адамкнуць» кабінет

Каб стаць паўнаватасным «лічбавым» грамадзянінам і «адамкнуць» свой асабісты кабінет, у чалавека павінна быць ID-картка; прылада, з якой можна ўвайсці на АПЭП (камп'ютар ці ноўтбук); бясплатная спецыяльная праграма, якую трэба спампаваць на прыладу, з якой чалавек збіраецца ўвайсці ў асабісты кабінет; счытвальнік новага пашпарта. Апошнюю прыладу трэба набываць за грошы, і яна бывае вельмі рознай па кошце, магчымасцях і тэхнічным выкананні, што вельмі няззручна. Таму цяпер распрацоўваецца спецыяльнае праграмнае забеспячэнне (ПЗ), якое адказвае за аўтарызацыю і перанос звестак з ID-карткі на пэўную прыладу (у дадзеным выпадку — мабільны тэлефон). Яно будзе бясплатным і на працягу года павінна з'явіцца, падзялілася эксперт:

— Такім чынам счытвальнікам стане любы смартфон. Адпадзе неабходнасць набываць спецыяльную прыладу для счытвання — дастаткова спампаваць спецыяльнае ПЗ на смартфон, прыкласці да яго ID-картку — і ўсё запрацуе.

Каб увайсці ў асабісты кабінет цяпер, трэба зрабіць наступнае. Набраць у браўзеры адрас portal.gov.by (старая версія АПЭП) ці platform.gov.by (новая версія АПЭП). (Калі скончыцца пераходны перыяд, новы адрас, на які цяпер пераносяцца ўсе электронныя паслугі, і дзе створаны асабістыя кабінеты ўсіх беларусаў, пераймінуюць ізноў у звыклы карыстальнікам адрас portal.gov.by.) Затым трэба спампаваць праграму на камп'ютар, прыкласці да счытвальніка ID-картку і аўтарызавацца ў асабістым кабінеце. Усё — вы «лічбавы» чалавек.

— У кабінеце можна ўказаць, куды трэба дасылаць паведамленні пра тое, што чалавеку нешта прыйшло ў кабінет, каб не сядзець у ім увесь час, чакаючы, калі прыйдзе адказ на нейкі зварот. Гэта можа быць SMS на тэлефон, паведамленне ў сацсетку, ліст на электронную пошту, — дадала Святлана Караневіч.

Непасрэдна ў кабінеце ёсць спіс даступных паслуг, з часам пры выкарыстанні кабінета створыцца і спіс паслуг, якія чалавек будзе заказваць з моманту актывацыі кабінета, а таксама спіс адказаў на звароты карыстальніка. Тут ёсць і фінансавая інфармацыя: можна прывязаць да акаўнта ў асабістым кабінеце рахунак, каб атрымліваць паслугі, за якія трэба плаціць грошы, па перадаплаце.

Асабісты кабінет карыстальніка існуе, пакуль жыве беларус. Калі статус асобы ў рэгістры насельніцтва мяняецца на неактыўны (чалавек памірае) — асабісты кабінет блакіруецца і дэактывуецца, увайсці ў яго нехта іншы ўжо не зможа. Звесткі ў рэгістры абнаўляюцца штодня.

**Ірына СІДАРОК.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Сталічны ракурс

# ЛЫЖНЫЯ ТРАСЫ — КАМФОРТ ДЛЯ МІНЧАН



**У сталічных жыхароў расце попыт на спартыўныя аб'екты ў горадзе, а завяршэнне зімовага сезона не закрывае лыжныя трасы да наступнага снежнага надвор'я. Гарадская інфраструктура дае магчымасць насельніцтву з задавальненнем праводзіць свой спартыўны вольны час у любую пару года. Начальнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Максім ВАРАПАЙ расказаў аб паспяховым зімовым перыядзе і аб нагрузках на лыжныя трасы ў летні перыяд.**

*— Галоўнай пляцоўкай для аматараў лыжаў узімку стала траса ў Вяснянцы. Там, акрамя звычайных лыжных шпацыраў нашых гараджан, праводзіліся і прафесійныя мерапрыемствы, і школьныя, і студэнцкія спаборніцтвы. На летні перыяд гэтая траса будзе задзейнічана для лыжаролераў — такое спартыўнае хобі ўжо стала звыклым для мінчан.*

У пачатку года для жыхароў Мінска зрабілі трасы са штучным снегам яшчэ ў трох сталічных месцах: лесапарку «Мядзвежына», парку «Курасоўшчына» і на вуліцы Цікоцкага. Лыжная даступнасць павялічылася — амаль ва ўсіх раёнах горада з'явіліся дастойныя маршруты.

Максім Варапай лічыць, што для мінскага насельніцтва ўласцівая разнастайнасць у выбары спартыўнага адпачынку. *— Немагчыма вызначыць, на чым можна сканцэнтравацца ў праектаванні новых аб'ектаў,* — кажа суразмоўнік. *— З-за двухмільённага мінскага насельніцтва нельга вызначыць дакладную колькасць наведвальнікаў. Гэта парк. Сёння гуляе 10 чалавек, заўтра на прабежку выйдуць 30. Хтосьці спакойна катаецца на роліках, а камусьці страшна на лыжаролерах — таму што можна ўпасці, пабіць калена і г. д. Дакладна магу сказаць, што і ў летні перыяд лыжныя трасы будуць выкарыстоўвацца спартыўнымі школамі.*

Аматары лыжаролераў у летні перыяд будуць катацца па трасе ў Вяснянцы, Парку 900-годдзя Мінска і на вуліцы Цікоцкага, дзе ім давядзецца дзяліць тэрыторыю з веласіпедыстамі. Абсталяваныя асфальтаваныя трасы — прыемны бонус для мінчан, якія аддаюць перавагу здароваму спосабу жыцця.

За зіму ў Мінску выкарыстоўваліся 14 лыжных трас з агульнай працягласцю 20 кіламетраў. У іх лік уваходзяць як прафесійныя, так і прагулачныя. Максім Варапай тлумачыць, што мінчане прывыклі самастойна праводзіць маршрут для лыжні, дзе зручна і каб не перашкаджаць астатнім. Лыжнікаў можна было сустрэць на Цнянскім вадасховішчы, школьных стадыёнах і ў парках. Добры прыклад — абсталяваная тэрыторыя ў Курасоўшчынскім парку: у гэтым зялёным масіве людзі гуляюць, бегаюць, возяць калыскі з дзецьмі — усім камфортна.

*— Перазагрузкі па лыжных трасах няма, гэта датычыцца і лыжаролерных трас — яны даступныя. На Ванеева функцыянуе аб'ект для паўнаватасных трэніровак. І ўсё ж у мінчан прыярытэт на агульнадаступнасць. Напрыклад, для жыхароў Першамайскага раёна ёсць траса ў Севастопальскім парку, на 2 кіламетры: можна прабегчыся, а можна пракацицца і на веласіпедзе з лыжаролерамі.*

Налета для мінчан плануюць здаваць у арэнду лыжны інвентар у парку «Курасоўшчына» і ў гарналыжным цэнтры «Сонечная даліна». Жадаем сталічным жыхарам бавіць з задавальненнем час на свежым паветры, падтрымліваючы фізічную форму!

**Аляксей КАРПУК.**

# МЯДОВЫ МЕСЯЦ НА ТУРАЎСКІМ ЛУЗЕ



**Да Міжнароднага дня птушак, 1 красавіка, супрацоўнікі Тураўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі і Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» рыхтуюць свята для беларускіх бёрдвотчараў. На набярэжнай ракі Прыпяць педагогі і навучэнцы экалагічных гурткоў Цэнтра творчасці традыцыйна арганізоўваюць акцыі па назіранні за птушкамі. Гэта работа з дзецьмі па папулярызацыі аднаго з самых займальных навуковых хобі — бёрдвотчынгу — натхніла арнітолагаў-аматараў Турава зрабіць традыцыяй і свята птушак, на якім кожны знойдзе занятак па інтарэсах.**





У гарадзе больш за семдзесят школьнікаў наведвае экалагічныя гурткі мясцовага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Нядаўна іх навучэнцы і педагогі правялі акцыю «Жывая вясна». **Дырэктар Тураўскага цэнтра творчасці Алена ПАКЛОНСКАЯ** расказала, як дзеці вучыліся назіраць за птушкамі ў падзорныя трубы і бiноклі.

— Галоўная ўмова пры назіранні — цішыня. Дзяцей гэта дысцыпліную, вучыць уважлівасці і развівае памяць. Яны запамінаюць вонкавы выгляд, адрозненні, галасы, звычкі птушак, — падкрэслівае кіраўнік Цэнтра. — Дзеці змаглі ўбачыць, што ўжо прыляцелі да нас кнігаўкі, качкі, гусакі, чайкі і крачкі, кані і асобныя віды кулікоў. Белая блакітніца-князёк гняздуецца толькі на Палессі і з'яўляецца вельмі рэдкай. Многія бёрдвотчары прыязджаюць здалёк, толькі каб убачыць яе. На нашы азёры, дзе шмат корму, прылятаюць чарада вялікіх грацыёзных чапляў.

Педагог адзначае, што менавіта Тураўшчына з яе велізарнымі пойменнымі сенажацямі дае магчымасць для назіранняў за птушкамі ў любую пару года. Бо вядома, што па колькасці і разнастайнасці відаў птушак гэтая тэрыторыя Сярэдняй Прыпяці значна пераўзыходзіць многія часткі Еўропы. Нездарма яе называюць «птушынай Меккай».

Падчас акцыі юныя тураўскія эколагі разам з педагогамі і студэнтамі Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта змаглі самастойна зрабіць штучныя гняздоўі для соў.

— Совы не робяць гнёзды самі, — тлумачыць Алена Паклонская, — звычайна засяляюць гнёзды крумкачовых. Апошнія гады ў гарадзе ссякаюцца старыя вялікія дрэвы, і вушастыя совы адляцелі. Платформы для соў разам з навучэнцамі рабілі з таннага падручнага матэрыялу — лазовых прутоў. Дарэчы, штогод лазовыя кусты высякаем сіламі валанцёраў. Наш пойменны луг зарастае гэтай кізінай вярбой. Яна замінае сяліцца кулікам і з'яўляецца вялікай пагрозай для гэтых тундравых птушак. Цяпер вось знайшлося карыснае ўжыванне лазе. З прутоў вярбы атрымалася добрая замена платформам для соў.

Платформы навучэнцы экалагічных гурткоў узнялі на дрэвы. Дзеці спадзяюцца, што совы вернуцца ў гэтыя мясціны. Навучэнцы школ горада непасрэдна на набярэжнай пабудавалі сінічнікі для розных відаў птушак, каб уладкаваць іх на школьным двары ў парку горада.

Змаглі дзеці паназіраць за працэсам і нават паўдзельнічаць у кальцаванні. Як распавяла Алена Паклонская, у Тураве знаходзіцца адзіная ў Беларусі арніталагічная станцыя водна-балотных і каляводных птушак. Кальцаваць кулікоў у пойме ракі Прыпяць з 1980-х гадоў пачаў арнітолаг Прыпяцкага ландшафтна-гідралагічнага запаведніка Вадзім Клакоцкі, а ў 1999 годзе была адкрыта станцыя кальцавання. Падчас акцыі навучэнцы даведаліся, як адлоўліваюць птушак і для чаго тое робіцца, таксама пра шляхі міграцыі і важнасць маніторынгу пералётаў. Усе ахвотныя маглі паглядзець, як праводзіцца кальцаванне і вымярэнне птушак. Многім было прыемна патрымаць птушку ў сваіх руках і выпусціць яе на волю адразу пасля кальцавання.

Алена Паклонская расказала, чым асабліва можна зацікавіць юных арнітолагаў-аматараў:

— Цяпер прылятаюць на Тураўшчыну рэдкія віды, якія застануцца ў нас толькі некалькі тыдняў, пакуль будуць карміцца. Час ад часу можна назіраць проста ўздоўж дарогі да дзвюх тысяч гусей белалобых. Кулікі — тундравыя птушкі, прылятаюць з Афрыкі. Асобныя іх віды пераадольваюць да сямі тысяч кіламетраў. Яны праз нашу тэрыторыю ляцяць на поўнач, але частка застаецца тут. Падлічана, што стабільна 35 відаў кулікоў застаецца на Тураўскім лузе. Разнавіднасць кулікоў — турухтаны — у нас падкормліваюцца пасля пералёту і тут праводзяць свае шлюбныя гульні, такі птушыны мядовы месяц на Тураўшчыне атрымліваецца. Надзвычайную цікавасць арнітолагаў выклікае апярэнне розных відаў самцоў турухтанаў падчас шлюбных гульняў. Яно ніколі не паўтараецца ў прыродзе.

Для птушыных акцый педагогі Цэнтра творчасці рыхтуюць не толькі для дзяцей, але і для гараджан любога ўзросту гульнявыя пляцоўкі з экалагічнымі квэстамі. Ахвотныя ўдзельнічаюць таксама ў майстар-класах па вырабе сувенірных птушак з воўны, паперы ці экаматэрыялаў.

— Са сваёй практыкі далучэння дзяцей і моладзі да бёрдвотчынгу, а таксама клубнай работы з гарадскімі арнітолагамі-аматарамі больш сталага ўзросту магу сказаць, што птушкі мяняюць наша жыццё. Усе, ад малога да вялікага, хто захапіўся назіраннем за птушкамі на Тураўскім лузе, па-першае, перасталі шмат часу марнаваць дома перад тэлевізарамі ці камп'ютарамі, пачалі больш бываць на свежым паветры, палюбілі вандраваць, пашыраюць зносіны з рознымі цікавымі людзьмі, якія таксама захапляюцца бёрдвотчынгам. Гэта не можа не радаваць. Для нас знаёмства з Тураўскім лугам і ўнікальнымі відамі птушак, якія прылятаюць да нас, — магчымасць дакрануцца да жывой прыроды, зведаць яе прыгажосць, навучыцца цаніць, — упэўненая тураўскі педагог.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Тураўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.**

# Сабраць бярозавыя «слёзы»

## Як адбываецца нарыхтоўка і рэалізацыя соку ў Слуцкім лясгасе

**У Беларусі пачаўся сезон нарыхтоўкі бярозавага соку. Традыцыйна першымі пакаштавалі папулярны вясновы напой жыхары паўднёвых рэгіёнаў. Аднак цяпер чарга дайшла і да асобных раёнаў Мінскай вобласці. Мы адправіліся ў Слуцкі лясгас, каб паглядзець, які шлях праходзіць бярозавік перад тым, як трапіць на нашы абедзенныя сталы.**








Вядома, усё пачынаецца з лесу. На тэрыторыі Урэцкага доследна-вытворчага лясніцтва Слуцкага лясгаса ёсць вялікі ўчастак, дзе нарыхтоўваецца бярозавік. Спецыялісты адзначаюць пэўныя правілы: нарыхтоўка соку праводзіцца не менш чым за 5 гадоў да надыходу ўзросту высечак. Больш за тое, для гэтага падыходзяць толькі дрэвы дыяметрам ад 20 см.

Дапусцім, прыдатная бяроза выбрана. Што далей? На вышыні 35-50 см вызначаюцца колькасць і размяшчэнне адтулін у залежнасці ад дыяметра ствала. Пры дыяметры ад 20 да 26 см — не больш за адну адтуліну; ад 26 да 34 см — не больш за дзве; ад 34 да 40 см — не больш за тры.

Першапачаткова выдаляецца грубая кара. Адтуліны свідруюцца толькі тады, калі пачынаецца рух соку. Гэта правяраецца пры дапамозе праколаў шылам. Адтуліны прасвідроўваюцца да 1 см у шырыню, ад 2 да 3 см — у глыбіню. Пасля ўстанаўліваюцца жалабкі, да якіх прымацоўваецца тара. У дадзеным выпадку гэта былі поліэтыленавыя пакеты. Таксама прапілы можна рабіць на адлегласці бензапілой. Шырыня — да 12 см, глыбіня — ад 3 да 4 см. Яны робяцца з невялікім нахілам уніз, каб рух соку быў лепшым. Па словах спецыялістаў, у сярэднім адно дрэва можа даць да 200-300 л бярозавіку за сезон.

Усё зразумела, аднак ці мае права звычайны чалавек прыйсці ў лес, набраць соку і не атрымаць пры гэтым штраф? Вось як пракаментаваў гэта **інжынер па лесакарыстанні Слуцкага лясгаса Яўген ВЕРАМЕЙЧЫК:**



*— Нарыхтоўваць бярозавік маюць права і лясгасы, і насельніцтва. Але насельніцтва павінна звярнуцца ў структурнае падраздзяленне лясгаса лясніцтва і атрымаць на гэта дазвол. Плаціць не трэба. Але спецыялісты павінны паказаць людзям тэрыторыю, дзе можна нарыхтоўваць сок.*

Атрымліваецца, што самавольная здабыча бярозавіку забароненая. За гэта прадугледжваецца адміністрацыйная адказнасць і штраф да 20 базавых велічынь. Зразумела, калі бяроза стаіць у вас на тэрыторыі, гэта зусім іншая справа. Вы маеце поўнае права нарыхтоўваць столькі соку, колькі душа жадае.

Ёсць і просты шлях, без рызыкі штрафаў: бярозавік заўжды можна набыць у лясгасе. Цана залежыць ад попыту. Напрыклад, у Слуцкім лясгасе літр соку каштуе 30 капеек, а вось у Мінскім — ужо 48. Таксама за невялікую даплату даецца тара для тых, у каго яе няма.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

**Міхаіл КРОТ:**

# «Я АДЧУВАЮ, ШТО ЖЫВУ, ПАКУЛЬ МАЛЮЮ»

**Прывабнасць мастацтва ў тым, што яно нікога не пакідае раўнадушным. Кожны знойдзе для сябе нешта цікавае: карціны, якія западаюць у самае сэрца, незвычайныя лёсы мастакоў... На адной выстаўцы можна цалкам адчуць бязмежную сілу чалавечага таленту. «Звязда» разам з галерэяй «АртХаос» вырашылі пазнаёміць усіх з гэтай сілай. У прыватнасці, з творчай сілай мастака Міхаіла Крата, чыя выстаўка «Сезоны» адкрытая для наведвальнікаў галерэі «АртХаос». Яго карціны нібыта аб'ядноўваюць увесь свет: лета і зіму, вёску і горад, мінулае і сучаснае. Тут няма складаных сюжэтаў і патаемных сэнсаў. Толькі адлюстраванне прыгажосці беларускіх мясцін, іх гісторыі ў розныя часы. Пераходзячы ад карціны да карціны, глядач можа пабываць у сцюдзёнай зіме і ў гарачым леце, у маленькай вёсцы і вялікім горадзе. Як такое магчыма, Міхаіл Крот расказаў «Звяздзе».**



***— Міхаіл, чаму справай вашага жыцця стаў менавіта жывапіс?***

— Я нават і не марыў, што буду мастаком, крыху маляваў у дзяцінстве, атрымлівалася нядрэнна. Бацька быў кіроўцам, таму я зацікавіўся аўтадызайнам і хацеў свае здольнасці прымяніць у гэтай сферы. Нават збіраўся паступаць у дарожна-будаўнічы тэхнікум на аўтамеханіку, каб зразумець спецыфіку. У маім пасёлку не было мастацкай школы, каб развіваць здольнасці, таму я проста вучыўся і крыху маляваў. Пакуль у наш дзясяты клас не ўвайшоў Аляксандр Сяргеевіч Пясецкі, які набіраў дзяцей да сябе на курсы. Аднакласнік за мяне падняў маю руку, маўляў, я хачу маляваць. Так я стаў займацца ў Аляксандра Сяргеевіча, ён стаў маім першым настаўнікам па выўленчым мастацтве. Ён жыў гэтым і мяне захапіў. Мы не проста нешта малявалі, вывучалі азы — Аляксандр Сяргеевіч расказваў нам гісторыю мастацтваў, паказваў вялізныя каталогі з карцінамі. Для невялікага пасёлка гэта было нешта дзіўнае. Ён жа мне расказаў і пра мастацкае вучылішча. І я зразумеў, што мастак — не нейкі міфічны вобраз у берэце і з барodkай, а абсалютна рэальная прафесія, якой можна навучыцца. Я загарэўся і паступіў у Гомельскае мастацкае вучылішча. Там, у гэтым мастацкім асяроддзі, была нейкая паралельная рэчаіснасць, якая мне спадабалася, і я захацеў больш вучыцца і развівацца.

***— А як бацькі паставіліся да вашага выбару. Звычайна старэйшае пакаленне лічыць, што мастацтва — несур'ёзная прафесія?***

— Мае бацькі сталі выключэннем. Яны былі толькі за і падтрымалі. Гэта вельмі рэдкі выпадак. Я сам бачыў, як да таго ж Аляксандра Сяргеевіча Пясецкага прыходзілі бацькі і забіралі дзяцей з заняткаў. Маўляў, ім трэба вучыць матэматыку, фізіку і атрымліваць сур'ёзную прафесію. А мастацтва, што — несур'ёзная прафесія? А потым тыя ж бацькі прыходзілі і прасілі правесці з іх дзецьмі некалькі заняткаў перад паступленнем. Магчыма, мне пашанцавала з генамі. Мая мама нядрэнна малюе. Я цікавіўся сваімі продкамі. І бабуля расказвала, што ў яе быў стрыечны брат, які ў 1930-я гады, падробліваў дакументы, грошы, даведкі. Яго, канешне, арыштавалі, павінны былі нават расстраляць. А ён у турме па памяці намаляваў усю сям'ю Сталіна і адправіў прашэнне аб памілаванні. Калі яго выпусцілі, то ён змог уладкавацца мастаком у тэатры.

***— Работы якіх мастакоў больш за ўсё зачапілі вас, калі вы знаёміліся з жывапісам?***

— Больш за ўсё па душы мне прыйшлася руская мастацкая школа канца XIX — пачатку XX стагоддзя: Рэпін, Сурыкаў, Левітан, Каровін. Беларускія мастакі спадабаліся — Бяльніцкі-Біруля, Жукоўскі. Я рос на класічнай школе. Тады не разумеў таго ж Пікасо ці Ван Гога. Але іх творчасць — таксама базіс, неабходны для тых, хто займаецца мастацтвам. Аднак гэтага недастаткова, патрэбныя веды. На другі год вучобы ў мастацкім вучылішчы я зразумеў, што мне трэба паступаць у Акадэмію мастацтваў. Гэта стала маёй мэтай. І адразу пасля вучылішча я туды паступіў на станковы жывапіс. На той час у модзе быў дызайн, і я хацеў туды, гэта было модна і крэатыўна. Але мне намякнулі, што лепш ісці на жывапіс. Я і не шкадую, што так усё атрымалася.



***— Значыць, мастакам патрэбная тэорыя?***

— Неабходная. Самая вялікая памылка маладых мастакоў — калі яны думаюць, што ім не патрэбная тэорыя. Многія пасля вучылішча не ідуць у акадэмію, думаючы, што ўсё ведаюць. Але ёсць пэўная сістэма, шлях, які трэба прайсці. У акадэміі сістэмна даюць вопыт, які мастакі напрацоўвалі гадамі. Самастойна не заўсёды можна яго спазнаць. Калі я пішу карціну, усе правілы трымаю ў галаве. Здараецца, што вобраз у думках ёсць, а рэалізаваць яго на палатне не атрымліваецца. А калі ёсць веды аб кампазіцыі, аб тым, як змяшаць фарбы і іншае, — усё рэальна. Адукацыя дае разуменне, што трэба рабіць. Але прыходзіць гэтае разуменне толькі з вопытам.

***— Міхаіл, раскажыце, калі ласка, як фарміраваўся ваш мастацкі стыль?***

— Мяне заўсёды цягнула да пейзажу. Пакуль я не разумею, які сюжэт магу стварыць і што гэтым скажу. Спробы былі, але далей справа не зайшла. А стыль... Сама натура дыктуе, што трэба рабіць і як. Гэта цяжка растлумачыць. Натурная работа — гэта збор эмоцый, уражанняў, пачуццяў, яны ствараюць хвалю, на якой і пішуцца карціны. У нас ёсць супольна мастакоў, мы разам ездзім на пленэры, вандруем па Беларусі. Аднаму гэта не так цікава, а з сябрамі зручней і весялей. Мы ўжо наведалі шмат цікавых месцаў. Напрыклад, я ніколі не быў у Слоніме і Мсціславе, паехалі туды на пленэр, і я быў вельмі ўражаны. А першыя ўражанні самыя важныя, і на іх аснове ўжо ствараюцца вобразы. Спачатку нібыта проста змалёўваеш, а потым далучаюцца эмоцыі — і так ствараецца серыя вобразаў. А пасля ўжо выбудоўваеш кампазіцыю, надаеш нейкі сэнс. Так і нараджаецца карціна. У мяне даволі зразумелы стыль, я не ганюся за эфектамі. У сяброў свае асаблівасці. Але цікава, што людзі бачаць нас аднолькавымі. А мы не разумеем, як так, мы ж абсалютна розныя. Так мы разам і працуем у пейзажным рэчышчы. Старыя традыцыі, можа, сёння нямодныя, несучасныя. Але нам цікава.

***— Вы кажаце, што шмат вандруеце па Беларусі. А дзе ў нас самыя маляўнічыя мясціны?***

— Беларусь у цэлым уся цікавая і прыгожая. І кожны раз хочацца бачыць новыя мясціны. Напрыклад, я амаль нічога не ведаў пра Слонім. А там аказаліся такія ландшафты, што можна не адну карціну стварыць. Гальшаны вельмі спадабаліся, там можна проста гуляць і любавацца прыгожымі відамі. Беларусь багатая на прыгожыя месцы. І ў любую пару года, у любы сезон на адным і тым жа месцы можна пісаць мноства карцін. Вельмі прыемна, што людзям наша творчасць цікавая. Мне нейк прапанавалі зрабіць выстаўку ў Полацку. А я прапанаваў, каб мы з сябрамі выставіліся: некалькі мастакоў лепей, чым адзін. Мясцовыя жыхары былі ў захапленні, людзям гэта цікава.

***— А пра іншыя краіны што можаце сказаць?***

— Прывяду ў прыклад Арменію, Чарнагорыю — там зламалася маё бачанне святу і колеру. У гэтых краінах зусім іншыя колеры. Я са сваёй палітрай ствараў брудныя пейзажы. Першыя дні стаяў як школьнік, не ведаючы што рабіць. Пазнаёміўся з ялцінскім мастаком, і ён мяне навучыў правільна змешваць фарбы. Там яны вельмі яркія. Я думаў, што жыхары поўдня яркія колеры выкарыстоўваюць, таму што ў іх такія тэмперамент і бачанне. А аказалася — там рэальна такія колеры. Гэта было вельмі цікава. Здавалася б, ёсць жоўты, чырвоны і сіні. Але ў прыродзе яны выглядаюць зусім інакш, чым мы прывыклі.

***— У вас шмат вясковых пейзажаў. Чым выклікана такая любоў да сельскай мясцовасці?***

— Я сам з сельскай мясцовасці, і падчас вучобы амаль усе мае практыкі праходзілі ў вёсках. Мне гэта спадабалася, і напрыканцы вучобы нават з'явілася ідэя — прысвяціць карціны вёскам, якія паміраюць. Я прыязджаў у невялікую вёсачку, маляваў закінутыя хаты. Вяртаўся праз нейкі час, а аднаго дома ўжо не было, і зноў гэта месца пішу. Праз некалькі гадоў прыязджаю — ізноў нешта змянілася. І так кожны эцюд, гэта старонка гісторыі, па іх можна ствараць хранalogію вёскі. І я на гэтым зацыкліўся. Нават дыпломная праца ў мяне была з вясковымі матывамі.

***— Вады на вашых палотнах таксама нямала, у тым ліку і ў выглядзе снегу...***

— Там, дзе я нарадзіўся, вады мала, і я не так часта яе пісаў. А потым вельмі палюбіў краявіды рэк і азёр. Цікава назіраць за вадой, за тым, што ў ёй адлюстроўваецца. А зіма ўвогуле мой любімы сезон. Белы — гэта і не колер па сутнасці. На аснове белага, асабліва калі свеціць сонца, можна ствараць мноства колеравых гам. І гэта пакідае моцае эмацыянальнае ўражанне. Зімой мне нават працаваць камфортней. Летам горача, не хочацца нічога рабіць. А зімой, на холадзе, прыйшоў, памаляваў і пайшоў грэцца. Дзень карацейшы, і гэта надае пэўны экстрым, няма калі думаць, сумнявацца, ленавацца, трэба лавіць момант.

***— Міхаіл, вядома, што вы працавалі ў лічбавай графіцы, у кінаіндустрыі і нават у мультыплікацыі. Як так здарылася?***

— Пасля Акадэміі трэба было самастойна зарабляць на жыццё, недзе жыць, патрэбна праца. Я ўладкаваўся ў майстэрню Міхаіла Савіцкага. У мяне была свая майстэрня, нейкая зарплата. Але грошай не хапала. Якраз таварыш, які працаваў дэкаратарам у кіно, шукаў памочнікаў. Гэта было цікава, я атрымліваў вопыт і грошы, засвойваў камп'ютарную графіку. Працаваў над дэкарацыямі для кіно і серыялаў. У мультыплікацыю трапіў па такой жа прычыне. Запрасіў аднакурснік, які працаваў у студыі, што стварала першы ў Беларусі 3D-мульцік «Робікі». Тут трэба было і ўмець маляваць, і на камп'ютары працаваць. Здавалася б, што такога — героя мульціка прыдумаць! Але на самай справе не так ужо і лёгка стварыць персанажа, які б выклікаў у чалавека пэўныя пачуцці і эмоцыі. Дарэчы, гэты мультфільм нават у Канах паказвалі.

***— Цікавы занятак для чалавека, які вырас на класічнай школе...***

— Мне гэта было цікава для развіцця. Але я адчуваў, што губляю час. Займаючыся кіно і мультыплікацыяй, я не займаўся жывапісам. Гэта быў бег на месцы. Мае калегі растуць, ладзяць выстаўкі, а я малюю для сябе. Нават бывала такое, што я ноччу прачынаўся, да раніцы пісаў і ішоў на працу. Доўга ў такім рэжыме нельга было жыць. І я ўсё кінуў і паехаў у вёску. Іншыя думалі, што я зрабіў крок назад, проста здаўся. А я стаў спакойна маляваць і выкладваць свае работы ў сацыяльныя сеткі. Людзей гэта зацікавіла, у мяне сталі купляць карціны. З часам я сабраў партфолія, мяне сталі запрашаць на пленэры. Прычым запрашэнні ішлі адно за адным і ў розныя краіны. І так атрымалася, што, зрабіўшы адзін крок назад, я зрабіў тры наперад.

***— Міхаіл, у вас часта здараецца творчы крызіс? Як з ім змагаецеся?***

— На шчасце, не ведаю, што гэта такое. У мяне цяпер вялікі творчы пад'ём. У кожным новым месцы я атрымліваю натхненне. Пасля кожнай паездкі натура дае ўражанні. У мяне цяпер столькі ідэй, што пра крызіс і думаць няма калі. Мне трэба столькі зрабіць, што я не ведаю, калі ўсё гэта паспею. Галоўнае — працаваць, а натхненне, ідэі самі прыходзяць. Штучна старацца нешта з сябе выціснуць не трэба, нічога не атрымаецца. Для мяне маляванне — як для рыбака рыбалка: я атрымліваю задавальненне ад працэсу. Гэта ўжо лад жыцця. Я адчуваю, што жыву, пакуль малюю. Адзін дзень не папішу, і ўжо настрой мяняецца, пачынаецца нейкая хандра. Ні дня без жывапісу не магу. Раней не разумеў, як такое магчыма, але з часам адчуў у на сабе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 2: цилиндр для расщипки, увлажнения и соусирования (106) зав. 01-120-422, 2002 г. в.
Начальная цена продажи лота – 33 000 руб. (тридцать три тысячи рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 3 300 руб. (три тысячи триста рублей)

ЛОТ 3: цилиндр соусирования (205) зав. 01-120-123, 2002 г. в.
Начальная цена продажи лота – 19 800 руб. (девятнадцать тысяч восемьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 980 руб. (тысяча девятьсот восемьдесят рублей)

ЛОТ 7: запасные части:
- ВАЛ РОХЛИКС 3410410231 РП.2 (2 шт.);
- ВТУЛКА 3410710040 (12 шт.);
- ВТУЛКА НАПР. ВЕРХНЯЯ 3410410060 РП.48;
- Выдвижной воздуховод 3410110352 (левый) 3410110353 (правый) РП.89 (4 шт.);
- ЗАЖИМНАЯ ПЛИТА Э.3410110136 (28 шт.);
- ЗАТОЧНОЙ КАМЕНЬ 3410410100 (104 шт.);
- КОЛЕСО ЧЕРВЯЧНОЕ 3410110122 РП.96 (5 шт.);
- КОНТРЛЕЗВИЕ 3410210284 (13 шт.);
- КОРПУС 3410410006;
- КОРПУС ПОДШИПНИКА;
- КРОНШТЕЙН 3410710015 (2 шт.);
- Муфта обгонная 3410112368 РП.97 (11 шт.);
- МУФТА СЦЕПЛЕНИЯ 3410410068 (9 шт.);
- НАПРАВЛЯЮЩАЯ ВЕРХНЕГО ТРАНСПОРТЕРА-НИЖНЯЯ РП.95;
- НАПРАВЛЯЮЩАЯ КОНВЕЙЕРА НИЖНЯЯ 3410710523 (2 шт.);
- НАПРАВЛЯЮЩАЯ ТОПА 3410710035 РП.36 (2 шт.);
- НАТЯЖНОЙ БАРАБАН 3410730083;
- НИЖНИЙ ВАЛ 3410510242;
- НОЖ Э341.071.0036-09 РП.46;
- НОЖИ СТАЛЬНЫЕ 3410110140 РП.31 (1650 шт.);
- ОСЬ ШАРНИРА 3410110142 (6 шт.);
- ПЛАНКА 34101110143 (10 шт.);
- ПЛАНКА РП.19 (4 шт.);
- ПЛАНКА ФОРМИРОВАНИЯ ТОПА 3410710036 (5 шт.);
- ПЛАНКАРП 8 (2 шт.);
- ПОДПЯТНИК 3410110137 (10 шт.);
- ПРИВОДНОЙ БАРАБАН 3410710084;
- ПРИВОДНОЙ БАРАБАН 3410510241;
- Раструбно-футеровочный блок Э.3410210524 СБ РП.87;
- Раструбно-футеровочный Э.3410210525 СБ РП.87/1;
- СКАЛКА GD 5 3410410072 (15 шт.);
- СТАНИНА КОНТРЛЕЗВИЯ 3410210240 SD5;
- Стойка Э.3410210524 РП.87/2 (4 шт.);
- Толкатель 3410110810 РП.35 (13 шт.);
- ТОЛКАТЕЛЬ 341011810 (4 шт.);
- ЧЕРВЯК 3410110121 (10 шт.);
- Червяк Э(СД-5) РП.16 (4 шт.);
- ШТОРА ЗАЩИТНАЯ 3410410158 (6 шт.).

Начальная цена продажи лота – 183 099,79 руб. (сто восемьдесят три тысячи девяносто девять рублей семьдесят девять копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 18 310 руб. (восемнадцать тысяч триста десять рублей)

ЛОТ 8: запасные части:
- ПОВОРОТНАЯ ПЛОЩАДКА 0072034;
- РАМА СЛАЙСЕРА X06SLISC1000.

Начальная цена продажи лота – 14 666,15 руб. (четырнадцать тысяч шестьсот шестьдесят шесть рублей пятнадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 466,62 руб. (тысяча четыреста шестьдесят шесть рублей шестьдесят две копейки)

**Продавец – Открытое акционерное общество «Гродненская табачная фабрика «Неман», 230771, г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18, тел. 79-15-00, факс 79-15-54**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70**

Условия проведения аукциона: победитель аукциона обязан оплатить имущество в форме 100 % предварительной оплаты в течение 15 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи; вывоз имущества со клада Продавца осуществляется за счет покупателя, погрузка осуществляется силами Продавца; имущество поставляется без упаковки в частично разобранном виде; возможна оплата предмета аукциона в иностранной валюте по официальному курсу соответствующей валюты к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44-BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 21 апреля 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 25.05.2021 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 19 апреля 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

---

И З В Е Щ Е Н И Е   О   П Р О В Е Д Е Н И И   А У К Ц И О Н А

## Государственное предприятие «МГЦН» **4 мая 2022 года** проводит **открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды** недвижимого имущества, находящегося в частной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Коэффициент к базовой ставке арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Арендодатель – ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»,** тел. 8017 375 34 35 | | | | | |
| 1 | г. Минск, ул. Алеся Бачило, д. 14 | 2487,1 | 1 и 2 этаж – 3,0; подвал – 1,0 | 2 101,6 | Под любые цели по согласованию с арендодателем | Капитальное строение 1990 года постройки. Назначение – здание специализированное розничной торговли. Наименование – Б 2/КП МАГАЗИН. Общая площадь здания – 2487,1 кв. м, в том числе площадь подвального помещения – 689,9 кв. м, площадь первого и второго этажа 1797,2 кв. м, площадь торгового зала 606,4 кв. м, площадь кафетерия 56 кв. м. Имеются центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, горячее водоснабжение, вентиляция, система кондиционирования, телефонная связь. Здание оборудовано системами пожарной сигнализации, охранной сигнализации, видеонаблюдения. Магазин оснащен торгово-технологическим, холодильным и тепловым оборудованием. Обязательные условия: 1) выкуп торгово-технологического оборудования в соответствии с перечнем, 2) аренда основных средств на сумму 575,41 рубля. В связи с проведением работ по технической инвентаризации, возможно внесение изменений в договор аренды, в части незначительного изменения общей площади магазина. **Срок аренды – 5 лет** |
| | **Арендодатель – ОАО «ГУМ»,** тел. 8017 343 10 92 | | | | | |
| 2 | г. Минск, ул. Орловская, д. 31 | 1297,5 | 3,0 (1-й этаж); 2,5 (подвал) | 1644,58 | Торговый объект (продовольственная и/или непродовольственная группа), медицинские услуги | Встроенное помещение на 1-м этаже жилого дома (площадь 768,9 кв. м) и подвал (площадь 528,6 кв. м). Имеются: центральное отопление, горячее и холодное водоснабжение, канализация и электроснабжение, система кондиционирования. Отдельный вход. Есть рампа. Помещение оборудовано охранной и пожарной сигнализациями, системой видеонаблюдения (отдельный договор аренды оборудования). Оборудовано приборами учета тепла, электроэнергии, воды. Имеется выносной холод. Продажа имеющегося оборудования по договорной цене. **Срок аренды – 5 лет** |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Форма торгов – открытый аукцион на повышение начальной цены.

Аукцион состоится **4 мая 2022 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 31 марта 2022 г. по 28 апреля 2022 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе**

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8 300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе по предмету аукциона № ___. Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

При подаче заявления на участие в аукционе:

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающие участвовать в аукционе, предъявляют документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариально).

**Порядок определения победителя аукциона:**

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – + 375 (17) 366 36 58.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»).

---

## Информация о проведении 5 мая 2022 г. 104-го открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в Солигорском районе

| № лота | 1 | 2 |
|---|---|---|
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды земельного участка | |
| Адрес земельного участка | Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск | Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Поварчицы, по улице Советская |
| Кадастровый номер | 625050100001003267 | 625086202101000352 |
| Площадь, га | 0,5838 (0,0002 – земли ОАО «Беларуськалий», 0,5836 – земли г. Солигорска) | 0,0742 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | Размещение объектов иного назначения (строительство и обслуживание общественно-делового центра, включая создание инкубатора малого предпринимательства) | Размещение объектов розничной торговли (строительство и обслуживание магазина) |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории* | Имеются развитая инженерная и транспортная инфраструктура, возможность подключения ко всем инженерным сетям | Имеются асфальтированные подъездные пути, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения, связи |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы – 0,0560 га, охранных зонах линий, сооружений электросвязи и радиофикации – 0,0518 га | Земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации – 0,0036 га |
| Начальная цена продажи, рублей | 47 141,85 | 212,54 |
| Сумма задатка, рублей | 9 428,00 | 42,00 |
| Срок аренды земельного участка / условия продажи | 20 лет / см. пункт 6 извещения о проведении аукциона** | 20 лет / см. пункт 6 извещения о проведении аукциона** |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, рублей | 5 315,27 | 3 345,40 |
| | + затраты на объявление в СМИ | |

**В разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте (массиве застройки). Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями. Возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам осуществляется на основании решения Солигорского районного исполнительного комитета от 11 февраля 2020 г. № 244.*

***Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (https://au.nca.by/), Минского областного исполнительного комитета – www.minsk-region.gov.by (Главная/Экономика и финансы/Земельные участки и извещения о проведении аукционов), Солигорского районного исполнительного комитета – www.soligorsk.gov.by (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы).*

**Организатор аукциона: Солигорский районный исполнительный комитет, г. Солигорск, ул. Козлова, 35. Контактные телефоны: 8 (0174) 23 73 86, 23 73 24. Аукцион состоится в 15.00 5 мая 2022 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.**

# СЫНОЎСКІ ДОЎГ

## Часам жыццё ставіць чалавека ў вельмі няпростыя абставіны. Ці ён сам сябе ставіць?

**«Восенню 2015 года, пасля паўторнага інфаркту галаўнога мозга, мая маці вярнулася дадому з шпіталя ў цяжкім стане, — падзяліўся з нашым выданнем жыхар Баранавіч Міхаіл С. — Цяжар захворвання прывёў да неабходнасці пастаяннага догляду і стаў пунктам адліку знішчэння майго жыцця»...**

Ляжачы хворы ў сям'і змяняе жыццё блізкіх: неабходны чалавек, які будзе займацца доглядам за ім, патрэбныя грошы і вольны час. Гэтыя няпростыя абавязацельствы ўзяў на сябе сын — яму давялося задумацца аб ліквідацыі ІП.

**«Згодна з заканадаўствам, каб запазычанасць была прызнаная безнадзейнай, неабходна выканаць некалькі ўмоў. У прыватнасці, павінна прайсці тры гады з моманту ўтварэння запазычанасці і ў даўжніка не павінна быць уласнасці, за кошт якой можна было б пагасіць доўг. Эканамічны суд Брэсцкай вобласці прыйшоў да высновы, што гэтыя ўмовы нявыкананыя».**

«Выдаткаваўшы некалькі месяцаў на тое, каб вырваць роднага чалавека з учэпістых лап смерці, я пачаў вывучаць пытанне аб магчымасці дзяржаўнай падтрымкі і даведаўся, што падача заявы аб ліквідацыі ІП не дае права на дапамогу, — распавядае ў пісьме Міхаіл Іванавіч. — Для гэтага дадаткова патрабуецца выключэнне з рэестра, на што сыходзіць некалькі месяцаў. А выключэнне з рэестра магчымае пасля поўнага разліку з дзяржавай. І калі падатковых абавязацельстваў, якія перашкаджаюць ліквідацыі, не было, то збор у ФСАН незалежна ад вынікаў працоўнай дзейнасці заплаціць я быў абавязаны (больш за дзве тысячы рублёў). А дзе мне было ўзяць грошы, калі ў папярэднія месяцы працаваць я не мог і практычна цалкам патраціў «падушку фінансавай бяспекі»?» — піша чытач.

Словам, сітуацыя вельмі складаная.

«На маіх руках была цяжкахворая маці — інвалід першай групы, якая мела патрэбу ў пастаянным доглядзе. Адсутнасць наёмных работнікаў і магчымасці працаваць самому пазбавіла мяне даходу ад прадпрымальніцкай дзейнасці. Пры гэтым сацыяльная дапамога нам была не прадугледжана — было зарэгістравана ІП. Для закрыцця ІП неабходна было аплаціць узносы ў ФСАН, на якія пасля месяцаў лячэння маці і майго вымушанага беспрацоўя грошай у мяне не было. Сітуацыю пагаршала наяўнасць на ўтрыманні траіх дзяцей, студэнта і двух непаўнагадовых. Для паўнаты карціны дадам, што жонка працаваць не магла, бо даглядала чатырохгадовую дачку... Пытанне фізічнага выжывання стала рэальнасцю нашага жыцця. А ў дадатак на мне ляжала абавязацельства па выплаце падаткаў на зямлю і нерухомасць»...

У 2016 годзе ад аддзела ФСАН Міхаіл атрымаў дасудовае патрабаванне аб выплаце збору за 2015 год. Не прымусіла сябе чакаць і завядзенне выканаўчай вытворчасці судовым выканаўцам па гэтым пытанні на суму каля 800 рублёў.

— Усе спробы растлумачыць маю сітуацыю і просьбы скасаваць іскі поспеху не прынеслі. Я быў вымушаны падаць заяву аб ліквідацыі ІП, працуючы з 1993 года!

«Мною былі зроблены спробы данесці сваю сітуацыю да ўладаў, — паведамляе Міхаіл Іванавіч, — падчас асабістай сустрэчы з міністрам працы і сацыяльнай абароны. Яна адзначыла, што «маці можа ганарыцца такім сынам», але спаслалася на адсутнасць заканадаўчых падстаў магчымага спісання іску».

У далейшым, адзначае чытач, норма, што ўзносы выплачваюцца незалежна ад ажыццяўлення і вынікаў прадпрымальніцкай дзейнасці, была адменена. Паводле Указа Прэзідэнта № 500 ад 28 снежня 2018 года ў выпадку адсутнасці даходаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці абавязацельства выплаты збору ў ФСАН адсутнічае. Аднак гэты нарматыўны прававы акт не распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі да яго ўваходжання ў сілу.

На сёння маці Міхаіла С. ужо няма ў жывых. ІП ён дагэтуль не закрыў з-за запазычанасці 2023 рублі 94 капейкі, якую чытач не пакідае надзеі афіцыйна прызнаць безнадзейным доўгам і спісаць у сувязі з абставінамі непераадольнай сілы. Дайшоў нават да Вярхоўнага Суда, дзе разглядалася яго касацыйная скарга, але рашэнне было вынесена не на яго карысць.

Сума запазычанасці, вядома, немаленькая. Але, магчыма, справа ўжо не толькі ў грашах... « Ці не занадта высокі кошт выстаўлены мне проста за тое, што я выканаў свой сыноўскі абавязак у адносінах да паміраючай маці?» — задае ён пытанне ў лісце. Сёння з-за гэтай запазычанасці па ФСАН ён можа пазбавіцца кватэры, якая дасталася яму ў спадчыну ад маці.

## Ці безнадзейная запазычанасць?

Згодна з заканадаўствам, каб запазычанасць была прызнаная безнадзейнай, неабходна выканаць некалькі ўмоў. У прыватнасці, павінна прайсці тры гады з моманту ўтварэння запазычанасці і ў даўжніка не павінна быць уласнасці, за кошт якой можна было б пагасіць доўг. Эканамічны суд Брэсцкай вобласці прыйшоў да высновы, што гэтыя ўмовы не выкананыя.

«У ходзе разгляду справы ўстаноўлены і пацверджаны факты заканчэння трохгадовага тэрміну з дня ўтварэння запазычанасці, неажыццяўленне ІП дзейнасці на працягу апошніх 6 месяцаў, якія папярэднічаюць дню пачатку праверкі дадзенага факта. Разам з тым дакладна ўстаноўлена наяўнасць маёмасці, што належыць заяўніку. С., звяртаючыся ў эканамічны суд, каб прызнаць запазычанасць безнадзейным доўгам, настойваў на наяўнасці ўсіх умоў, прадугледжаных Указам № 239, у тым ліку аб адсутнасці ў яго маёмасці для пагашэння запазычанасці».

— Калі б у нас былі ўсе падставы, прадугледжаныя Указам № 239, мы накіравалі б дакументы ў Брэсцкае абласное ўпраўленне Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва для прыняцця рашэння аб спісанні запазычанасці, — растлумачылі ў Баранавіцкім гарадскім аддзеле Брэсцкага ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. — Але чалавек прайшоў тры судовыя інстанцыі, уключаючы Вярхоўны Суд. І на ўсіх этапах суд дэталёва разбіраўся ў яго сітуацыі. Калі б былі хоць найменшыя падставы для спісання доўгу, у дадзенай сітуацыі, напэўна, суд прыняў бы пазіцыю грамадзяніна.

Аднак маёмасць прысутнічае, але з магчымасцю выкарыстоўваць яе для пагашэння запазычанасці Міхаіл Іванавіч катэгарычна не згодны.

«Дадзеная нерухомасць (кватэра, якую чытач атрымаў у спадчыну ад маці. — **Заўв. аўт.**) не мае ніякага дачынення да маёй прадпрымальніцкай дзейнасці, — падкрэслівае ён. — Я за яе больш як год змазваў раны і карміў з лыжачкі... А нерухомасць, пабудаваная ў шлюбе, пакінутая мной былой жонцы і траім дзецям. Недабудаваны дом у г. Баранавічы, абапіраючыся на малазначнасць сумы іску (каля двух працэнтаў ад кошту) не можа служыць падставай адмовы ў задавальненні маёй скаргі», — адзначае ён.



Але вернемся да моманту ўтварэння запазычанасці. «Згодна з пастановай Савета Міністраў № 1149 ад 2006 года, ІП пазбаўлены права на сацыяльную дапамогу па доглядзе за інвалідам», піша ў рэдакцыю Міхаіл Іванавіч.

Сапраўды, паводле гэтай пастановы, права на дапамогу па доглядзе за інвалідам І групы маюць «працаздольныя непрацуючыя, якія не займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, не навучаюцца ў навучальных установах дзённай формы атрымання адукацыі, асобы, якія не атрымліваюць пенсіі, дапамогі па беспрацоўі, штомесячнай страхавой выплаты ў адпаведнасці з заканадаўствам аб абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, штомесячнага грашовага ўтрымання ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе, якія ажыццяўляюць пастаянны догляд за непрацаздольнымі грамадзянамі».

Чалавек, на чые плечы кладзецца догляд за ляжачым інвалідам і які атрымлівае дапамогу па доглядзе, павінен быць не заняты ў эканоміцы, растлумачылі ў Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва г. Баранавічы. Маецца на ўвазе, што ён штодня ажыццяўляе догляд, і гэта яго работа — пра гэта робіцца запіс у працоўнай кніжцы. Сума дапамогі невялікая (сёння яна складае 296 рублёў 55 капеек), і, сутыкнуўшыся з падобнай сітуацыяй, людзі могуць звярнуцца па сацыяльныя паслугі.

— Сацыяльны работнік — гэта не сядзелка, — падкрэслілі ў тэрытарыяльным цэнтры. — Службовыя абавязкі сацыяльнага работніка — садзейнічанне: дастаўка прадуктаў пажылым людзям, дапамога па гаспадарцы. У дадзенай сітуацыі гаворка павінна была весціся менавіта пра сядзелку.

Сядзелку можна наняць як праз тэрытарыяльны цэнтр, так і знайсці самастойна. Гэта платная паслуга, кошт якой складае на сённяшні дзень у Баранавічах у сярэднім 1 рубель 16 капеек у гадзіну. Можна аформіць па доглядзе за інвалідам непрацуючага сваяка ці нават каго-небудзь з суседзяў, растлумачылі спецыялісты. У тэрытарыяльны цэнтр пісьмовых зваротаў па пытанні аказання паслуг сядзелкі ад Міхаіла С. не паступала.

## Літара закона

— Здараецца, індывідуальны прадпрымальнік больш не зацікаўлены працягваць сваю дзейнасць. У такім выпадку яму варта яе спыніць, — каментуе сітуацыю нашага чытача **адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ.** — Адносіны, звязаныя са спыненнем дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў, рэгулююцца Палажэннем аб ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання, зацверджаным Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.01.2009 № 1. Дзейнасць індывідуальнага прадпрымальніка можа быць спынена па адпаведных падставах, прадугледжаных Палажэннем для ліквідацыі юрыдычных асоб.

Пры спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка ў рэгіструючы орган падаецца заява па форме, устаноўленай Міністэрствам юстыцыі, падпісаная індывідуальным прадпрымальнікам, што спыняе дзейнасць, з указаннем у ім патрэбных звестак.

Рэгіструючым органам прадстаўляюцца адпаведныя звесткі ў Міністэрства юстыцыі, у падатковыя, мытныя органы, органы ФСАН Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, РУП «Белдзяржстрах», архівы, ва ўстанову «Рэдакцыя часопіса «Юстыцыя Беларусі». У рэгіструючы орган прадстаўляюцца, у тым ліку органамі ФСАН Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, даведка аб наяўнасці (адсутнасці) у індывідуальнага прадпрымальніка запазычанасці па плацяжах у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Пры наяўнасці ў суб'екта гаспадарання непагашанай запазычанасці перад бюджэтам па плацяжах у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага ФСАН Рэспублікі Беларусь, па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, няспыненых абавязацельстваў перад мытнымі органамі выключэнне суб'екта гаспадарання з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў ажыццяўляецца **толькі пасля прадстаўлення названымі органамі дакументаў, якія пацвярджаюць пагашэнне такой запазычанасці.**

Дзеючае заканадаўства аб ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання не прадугледжвае спрошчаны парадак ліквідацыі для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць членаў сям'і з інваліднасцю. Наяўнасць у аўтара звароту на ўтрыманні маці-інваліда не вызваляе яго ад выканання ўмоў, прадугледжаных заканадаўствам. З ліста аўтара відаць, што ў яго маецца запазычанасць перад ФСАН, пагасіць якую ён не мае фінансавай магчымасці, і распачата выканаўчая вытворчасць. Наяўнасць запазычанасці перад ФСАН пацягнула немагчымасць выключэння індывідуальнага прадпрымальніка з Адзінага дзяржаўнага рэгістра. Варта адзначыць, што ў адпаведнасці з арт.1 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прадпрымальніцкая дзейнасць — гэта **самастойная дзейнасць юрыдычных і фізічных асоб, якая ажыццяўляецца імі ў грамадзянскім абароце ад свайго імя, на сваю рызыку і пад сваю маёмасную адказнасць** і накіраваная на сістэматычнае атрыманне прыбытку. Бачыцца, што аўтар пытання рэалізаваў сваё права на абскарджанне ў эканамічны суд дзеянняў (бяздзейнасці) органаў ФСАН, аднак судовая калегія па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь не пагадзілася з яго довадамі і адмовіла індывідуальнаму прадпрымальніку ў задавальненні яго скаргі.

## І што ў выніку?..

А калі падысці да пытання проста па-чалавечы? Цяжкахворы сваяк — гэта, безумоўна, велізарнае выпрабаванне для ўсёй сям'і. Але хоць сума запазычанасці (якая, як сцвярджае чытач, утварылася з-за хваробы маці) вялікая, яна не настолькі «астранамічная», каб яе немагчыма было паступова пагасіць — бясконцыя суды патрабуюць, мабыць, не менш сіл і нерваў, і ў тым ліку пэўных матэрыяльных выдаткаў. Між тым, гэтая гісторыя цягнецца з 2015 года. І, здаецца, яшчэ не падышла да завяршэння... Пытанняў пакуль больш, чым адказаў.

**Дзіяна РОНІНА.**

Тэхналогіі будучыні

# МАШЫНА-«ХАМЕЛЕОН»

## З дапамогай дадатку можна змяніць яе дызайн




**Нямецкі аўтавытворца BMW прадставіў першы ў свеце аўтамабіль, які змяняе колер. Машыну паказалі на выставе Consumer Electronics Show у Лас-Вегасе, перадае Reuters.**

У канцэптуальным аўто, якое атрымала назву BMW iX Flow, выкарыстоўваецца электронная папера (іншая назва — E-Ink, электронныя чарнілы) — тэхналогія адлюстравання інфармацыі, распрацаваная для імітацыі звычайнага друку на паперы і заснаваная на з'яве электрафарэзу. Яе прымяняюць у электронных кнігах.

«Гэта сапраўды энергаэфектыўнае змяненне колеру з выкарыстаннем тэхналогіі E-Ink. Такім чынам, мы ўзялі гэты матэрыял — падобны на тоўстую паперу — і наша задача была ў тым, каб вырабіць яго на трохмерны аб'ект, такі як аўтамабілі», — распавяла інжынер-даследчык BMW Стэла Кларк.

Пад уздзеяннем электрычных сігналаў, якія кіруюцца дадаткам на тэлефоне, матэрыял пераносіць на паверхню розныя пігменты, у выніку чаго аўтамабіль набывае іншыя адценне або дызайн, напрыклад, з'яўляюцца гоначныя палосы.

Па словах Кларк, у будучыні змяненнямі можна будзе кіраваць з дапамогай кнопкі на прыборнай панэлі аўтамабіля ці, магчыма, нават з дапамогай жэстаў.

«У спякотны сонечны дзень вы можаце пераключыць колер на белы, каб адбіваць святло. У халодны дзень можаце пераключыць яго на чорны, каб паглынаць цяпло», — таксама адзначыла Кларк. У кампаніі кажуць, што падтрыманне колеру, абранага кіроўцам, не энергазатратнае. Пакуль што аўтамабіль падтрымлівае змену паміж белым і шэрым колерамі.

Пласты гісторыі

# ВЯСЁЛКАВЫЯ КУБКІ

## Аматар натрапіў на схованку з незвычайнымі манетамі



**У Германіі недалёка ад Берліна археолаг-аматар знайшоў сапраўдны скарб — старажытную схованку з залатымі кельцкімі манетамі, першы вядомы кельцкі залаты скарб у Брандэнбургу. Аб унікальнай знаходцы паведаміла міністр культуры Брандэнбурга Манья Шуле, перадае livescience.com.**

У схованцы налічылі 41 манету, усе яны былі адчаканены больш за 2000 гадоў таму. Паведамляецца, што скарб недалёка ад вёскі Байц знайшоў археолаг-добраахвотнік з Брандэнбургскага дзяржаўнага кіравання спадчынай Вольфганг Херкт. Першая знойдзеная манета нагадала яму вечка маленькай бутэлькі з-пад лікёру. Гэтыя незвычайныя манеты выгнутыя, такая іх асаблівасць паслужыла крыніцай нямецкай назвы «regenbogenschsselchen», што перакладаецца як «вясёлкавыя кубкі».

Па словах нумізмата і навуковага супрацоўніка Манетнага кабінета замка Фрыдэнштайн у Германіі Мар'янка Пілекіча, які вывучаў скарб, па народным павер'і, вясёлкавыя кубкі знаходзілі там, дзе вясёлка дакраналася да зямлі. Па яшчэ адной легендзе, вясёлкавыя кубкі «падалі проста з неба і лічыліся талісманамі на поспех і прадметамі з лячэбным эфектам».

Біялогія з анатоміяй

# ЧАМУ ЁН ТОРГАЕЦЦА?

## Эксперт распавёў аб небяспецы вочнага ціку



**Яго прычына можа быць не толькі ў стрэсе. Да такіх высноў у размове з журналістамі тэлекампаніі «Зорка» прыйшоў неўролаг, дацэнт кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Рустэм Гайфутдзінаў.**

На думку спецыяліста, вочны цік — з'ява сама па сабе несур'ёзная, можа з'яўляцца сімптомам хранічнага перанапружання. Але таксама ён можа быць вынікам міжвольнага скарачэння кругавой мышцы вока (блефараспазмам) або геміспазмам — захворваннем нервовай сістэмы, якое выклікае міжвольнае скарачэнне мышцаў твару.

Доктар Гайфутдзінаў растлумачыў, што вельмі важна своечасова распазнаць, якога роду гэтыя цікі: пастаянныя або эпізадычныя. Такім чынам, калі ўрач фіксуе ў чалавека вочны цік, а не скарачэнне мышцы, то пацыенту неадкладна трэба звярнуцца да псіхатэрапеўта, які выпіша седатыўныя прэпараты для лячэння. Калі ж цік — вынік больш сур'ёзнага захворвання, такога, напрыклад, як блефараспазм, то, паводле слоў спецыяліста, яго альбо лечаць заспакаяльнымі прэпаратамі, альбо звяртаюцца да нейрахірургічнай аперацыі.

Здароўе на талерцы

# СМАК МУЖНАСЦІ

## Якая сувязь паміж спажываннем мяса і ўпэўненасцю?



**Мужчыны, якія аддаюць перавагу чырвонаму мясу, схільныя да няўпэўненасці ў сваёй мужнасці. Да такой высновы прыйшлі канадскія вучоныя, паведамляе Daily Mail.**

У даследаванні ўзялі ўдзел 287 мужчын з Вялікабрытаніі і Канады. Ім прапаноўвалася прайсці апытанне аб успрыманні ўласнай мужнасці. Таксама рэспандэнтам паказалі выявы мясных страў і спыталі аб жаданні набыць прадукт. Навукоўцы ўстанавілі, што ўдзельнікі апытання, якія маюць «крызіс мужнасці», аддалі перавагу мясному стэйку.

«Нашы вынікі паказваюць, што мужчыны, занепакоеныя сваёй мужнасцю, могуць шукаць магчымасці павысіць яе з дапамогай ежы, якую спажываюць», — удакладніла адна з аўтараў даследавання Рыянон Макдонэл Меслер.

Нябачная пагроза

# НОС У ТЫТУНІ

## Звязалі паспяховасць дзяцей з курэннем іх бацькоў



**Навукоўцы з Мельбурнскага каралеўскага тэхналагічнага інстытута ў Аўстраліі правялі даследаванне і высветлілі, што дзеці, чые бацькі кураць, дэманструюць больш праблем у паводзінах і горш вучацца ў школе ў параўнанні з дзецьмі, чые бацькі не кураць. Аб гэтым гаворыцца ў часопісе Economics and Human Biology.**

Так, спецыялісты высветлілі, што дзеці бацькоў, якія не злоўжываюць тытунём, мелі больш высокі сярэдні бал па ўсіх паказчыках кагнітыўных тэстаў. Тыя, хто рос з мамамі і татамі, якія кураць, дэманстравалі ніжэйшы вынік. Таксама вучоныя ўстанавілі, што курэнне бацькоў зніжае акадэмічную паспяховасць іх дзяцей у сярэднім на 3 працэнты і пагаршае паводзіны на 9 працэнтаў.

Такім чынам, на думку аўтараў даследавання, атрыманыя вынікі падкрэсліваюць ролю сямейнага асяроддзя ў развіцці дзяцей у раннім узросце, якое закладвае аснову для іх здароўя, сацыяльнага і эканамічнага поспеху.

«Мы лічым, што кампаніі, накіраваныя на скарачэнне спажывання тытуню, павінны паведамляць яшчэ і аб ненаўмыснай шкодзе, якую курэнне бацькоў можа нанесці дзецям у сучаснасці і будучыні», — заявілі спецыялісты.

Акрамя таго, адзначаецца, што ўздзеянне другаснага тытунёвага дыму дома можа прывесці да шматлікіх праблем са здароўем у немаўлят і дзяцей, напрыклад да астмы або вушных інфекцый.

Каго мы бачым!

# У ДАПАМОГУ ЧЫРВАНАКНІЖНІКАМ

## Распачалося вывучэнне ДНК рэдкіх леапардаў і тыграў



**Спецыялісты расійскага нацыянальнага парку «Зямля леапарда» і Сеульскага нацыянальнага ўніверсітэта прыступілі да сумеснага даследавання ДНК рэдкіх папуляцый далёкаўсходняга леапарда, а таксама амурскага тыгра. Пра гэта паведаміла прэс-служба нацыянальнага парку «Зямля леапарда».**

Напачатку ў нацпарку група карэйскіх даследчыкаў разам з расійскім калегамі ў лабараторыі правядуць работу па вылучэнні генетычнага матэрыялу з больш чым 200 узораў біялагічнага матэрыялу леапардаў і тыграў, сабраных на паўднёвым захадзе Прымор'я ў дзікай прыродзе за апошнія два гады. ДНК-дактыласкапіяй затым зоймуцца ў Сеульскім нацыянальным універсітэце.

Адзначаецца, што на аснове атрыманай інфармацыі навукоўцы змогуць распрацаваць больш дэталёвыя стратэгіі захавання чырванакніжных жывёл, у тым ліку даследаванне дапаможа зразумець, наколькі добра папуляцыя сябе адчувае, наколькі высокая ў яе генетычная разнастайнасць.

Таксама сярод магчымасцяў выкарыстанага навукоўцамі метаду — вызначэнне віду, полу і роднасных сувязяў дзікіх жывёл на аснове генетычнага матэрыялу. Новае даследаванне дазволіць параўнаць паказчыкі з вынікамі навуковых пошукаў мінулых гадоў, прасачыць дынаміку змены генетычнай разнастайнасці.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# ГІЕНА Ў КАНВУЛЬСІЯХ

## Чаму ў Польшчы абвастрыўся рэваншызм

**Колішні камандуючы сухапутнымі войскамі Польшчы генерал Вальдэмар Скшыпчак узняў пытанне аб прэтэнзіях Варшавы на Калінінград у эфіры мясцовага тэлеканала Super Express. Ён заявіў, што Варшава павінна ўзняць пытанне аб прыналежнасці Калінінградскай вобласці, якую з 1945 года «акупавала Расія». Гэтую заяву пракаментавала афіцыйны прадстаўнік МЗС РФ Марыя Захарава. «Як падніме, так і апусціць», — напісала яна ў сваім Telegram-канале. Вярнуць Польшчы тое, што ніколі ёй не належала, у прынцыпе немагчыма, заявіў прэс-сакратар Калінінградскай вобласці Дзмітрый Лыскоў. «Пытанне гэтае вельмі дзіўнае, асабліва ў святле таго, што цяперашні польскі Гданьск зусім нядаўна называўся Данцыгам і належаў іншай краіне, таму не ім гэтыя пытанні відавочна задаваць», — падкрэсліў ён. Як вядома, сучасная Калінінградская вобласць размешчана на тэрыторыі былой нямецкай правінцыі Усходняй Прусіі. У 1945 годзе тут праходзілі баі Усходне-Прускай аперацыі савецкіх войскаў. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны па рашэнні Патсдамскай канферэнцыі частка нямецкай правінцыі (прыкладна траціна) адышла СССР, астатняя тэрыторыя — Польшчы. Такія вар'яцкія заявы апошнім часам паступаюць з Варшавы рэгулярна. Чаму ў Польшчы абвастрыўся рэваншызм, чым гэта пагражае?**





### Беспрэцэдэнтная мілітарызацыя

Як падкрэсліў у прывітальным слове ўдзельнікам міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Стратэгічныя нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь у кантэксце сучасных глабальных выклікаў», якая прайшла ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч, «працягваецца беспрэцэдэнтная мілітарызацыя заходніх дзяржаў». Паўночнаатлантычны альянс размясціў у Еўропе больш за сотню тысяч вайскоўцаў у рэжыме павышанай баявой гатоўнасці, гаворка ідзе таксама аб пяці авіяносных ударных групах. Пра гэта заявіў генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг, паведаміла ТАСС. «Войскі альянсу прыведзены ў рэжым павышанай гатоўнасці ва ўсіх краінах — членах НАТА. Размова ідзе аб 100 тысячах амерыканскіх войскаў у Еўропе, а таксама 40 тысячах пад непасрэдным камандаваннем НАТА, галоўным чынам ва ўсходняй часткі альянсу. «Ім усім аказваецца падтрымка марскімі і паветранымі сіламі, у тым ліку пяццю авіяноснымі ўдарнымі групамі на Крайняй Поўначы і ў Міжземнамор'і», — адзначыў Енс Столтэнберг. Раней ён паведаміў, што Паўночнаатлантычны альянс павялічыў абарончую прысутнасць авіяцыі, марскіх і сухапутных сіл для гарантавання бяспекі ўсходняй часткі альянсу.

«У прыгранічны Беларусі, у тым ліку на гродзенскім участку, адзначаецца канцэнтрацыя войскаў Польшчы», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. Міністр нацыянальнай абароны гэтай краіны Марыуш Блашчак заўважыў, што ў наступным годзе ваенныя расходы ў краіны ўзрастуць да трох працэнтаў ад ВУП (з цяперашніх 2 %), паведаміла РІА «Навіны». «Мы стварылі фонд падтрымкі ўзброеных сіл, гэта будуць дадатковыя грошы, якія мы будзем укладваць у нашу бяспеку», — дадаў ён. Як стала вядома, прэзідэнт Анджэй Дуда і прэм'ер-міністр Матэвуш Маравецкі абмяркоўваюць прапановы ўрада аб змяненнях у Канстытуцыі Польшчы. Гаворка ідзе аб выключэнні лімітаў расходаў на войска. Дуда заявіў аб імкненні давесці ваенныя расходы да 4 працэнтаў ВУП і агучыў намер павялічыць колькасны састаў Войска Польскага да паўмільёна чалавек (цяпер 128 тысяч).

Акрамя таго, у Польшчы па выніках чэрвеньскага саміту НАТА могуць з'явіцца пастаянныя ваенныя базы ЗША, заявіў Марыуш Блашчак. «Гэта ўсё абмяркоўваецца. Мы мэтанакіравана да гэтага ідзём», — сказаў ён. Паводле слоў міністра, на тэрыторыі Польшчы цяпер знаходзіцца больш за 10 тысяч амерыканскіх салдат. «У нас таксама ёсць брытанскія, румынскія і канадскія войскі, у нас ёсць салдаты з Харватыі, іх некалькі тысяч», — цытуе Марыуша Блашчака «Радыё Польшча».

### Пад заслонай тайны

Тэлеканал TVN паведаміў, што эскадраны мінаносец USS Forrest Sherman ВМС ЗША прыбыў у порт польскага горада Гданьска. На ўзбраенні эсмінца «сярод іншага» ракетныя ўстаноўкі і «прылады рознага калібру», перадаў тэлеканал. Адной з мэт яго прысутнасці ў краіне — запэўніць саюзнікаў з НАТА, што амерыканцы ў стане хутка рэагаваць на любую патэнцыяльную агрэсію ў рэгіёне, заявіў камандзір эсмінца Мэт Заблік.

Пры гэтым Пентагон не дае СМІ амаль ніякай інфармацыі, чым займаюцца перакінутыя ў Польшчу тысячы амерыканскіх вайскоўцаў, заявіў у інтэрв'ю Fox News незалежны журналіст Майкл Трэйсі, паведаміла RT. Ён адзначыў, што Пентагон не дазваляе нават «адабраным журналістам, якія былі б настроеныя на спрыяльнае ўспрыманне таго, што амерыканскія вайскоўцы робяць у Польшчы», прыехаць на месца падзей і паглядзець, чым вайскоўцы ЗША займаюцца ў непасрэднай блізкасці да зоны баявых дзеянняў. Падобная сакрэтнасць, паводле слоў журналіста, сама па сабе павінна выклікаць ва ўсіх непакой.

«Гэтыя аперацыі акружаныя заслонай тайны. Ведаеце, журналістам не дазваляюць нават зірнуць на тое, чым там займаюцца вайскоўцы. У Польшчу прыязджала дэлегацыя Кангрэса. Гэта была двухпартыйная дэлегацыя, якая складалася з кангрэсменаў. Я запытаў у членаў Кангрэса, якія ўдзельнічалі ў гэтай паездцы — як рэспубліканцаў, так і дэмакратаў, — проста базавую інфармацыю, што яны будуць рабіць: праграма візіту, расклад, хоць бы што-небудзь, — а мне сказалі, што яны не могуць падаць журналістам гэтых падрабязнасцяў з, цытую, «меркавання бяспекі». Што гэта за «меркаванне бяспекі»? Амерыка знаходзіцца ў стане вайны? Польшча знаходзіцца ў стане вайны», — адзначыў амерыканскі журналіст.

Майкл Трэйсі таксама лічыць, што ў канчатковым выніку Пентагон займаецца тым, што падагравае апасродкаваную вайну супраць Расіі. «Бен Сас, сенатар-рэспубліканец, казаў, што палітыка ЗША павінна складацца ў тым, каб садзейнічаць украінцам у плане іх магчымасцяў, цытую, — «забіваць рускіх». У гэтым і заключаецца сутнасць апасродкаванай вайны. І ў Польшчы менавіта гэта і адбываецца — садзейнічанне ў плане магчымасцяў за кошт вялікай колькасці амерыканскіх войскаў, разгорнутых у гэтай краіне», — адзначыў амерыканскі журналіст.

Апошнім часам СМІ неаднаразова паведамлялі, што бронемашыны з амерыканскімі сцягамі былі заўважаны паблізу ад беларуска-польскай граніцы. Відэа і фота з ваеннай тэхнікай ЗША актыўна дзеляцца кіроўцы, якія стаяць у пунктах пропуску.

### Не зусім адэкватныя

Па словах палітолага, кіраўніка расійскага інстытута палітычнага аналізу Сяргея Маркава, цалкам відавочна, што тое, што адбываецца, — велізарны, каласальны крызіс бяспекі, нябачаны ў апошнія дзесяцігоддзі. «Цяпер небяспека не меншая, а можа быць, і большая, чым у часы Карыбскага крызісу, — заўважыў галоўны рэдактар выдання «Сегодня.ру» Юрый Кацянок. — Сітуацыя надзвычай напружаная».

І вось на гэтым выбуховым фоне з'явілася прапанова «шэрага кардынала» польскай палітыкі, кіраўніка партыі «Права і справядлівасць», віцэ-прэм'ера Ярослава Качыньскага, які пасля паездкі ў Кіеў заявіў, што Украіне патрэбная міратворчая місія, падрыхтаваная НАТА «і, магчыма, іншымі арганізацыямі». Некаторыя палітолагі выказалі здагадку, што за ідэяй Качыньскага стаіць намер Варшавы «аслупаваць» заходнія, сумежныя з Польшчай тэрыторыі Украіны пры патэнцыяльным падзеле суседняй краіны.

«Лідары Польшчы не зусім псіхічна адэкватныя», — растлумачыў fedpress.ru Сяргей Маркаў. Варшава спрабуе прыкрыцца іншымі дзяржавамі, маючы на мэце свае экспансіяніцкія планы. Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» палітолаг Аляксей Дзермант, каментуючы прапанову Ярослава Качыньскага.

«На мой погляд, у Польшчы тут хутчэй такія тэрытарыяльныя апетыты. Таму што, прыкрываючыся войскамі НАТА, гэтай нібыта міратворчай місіяй, Польшча хацела б пашырыць зону свайго ўплыву. Гэта значыць, відавочна яна ўключала б Заходнюю Украіну. Мы ведаем, што ў Польшчы распаўсюджаныя такія рэваншысцкія настроі. Яны лічаць гэта сваімі ўсходнімі ўскраінамі, прынамсі, Заходнюю Украіну. Таму я думаю, што ў дадзеным выпадку палякі пад нібыта эгідай міратворчай місіі проста хочуць увесці туды свае войскі і ўсталяваць там зону кантролю», — сказаў Аляксей Дзермант.

Паводле яго слоў, фактычна гэта азначала б падзел Украіны, дзе Польшча атрымала б нейкія жаданыя землі. «Але пры гэтым нават не адна яна ўвяла б туды войскі, а менавіта цэлая кааліцыя НАТА. Гэта значыць, Польшча спрабуе яшчэ і прыкрыцца іншымі дзяржавамі, маючы свае экспансіяніцкія планы. Польшча ўся, па сутнасці, прасякнутая вось гэтымі рэваншысцкімі настроямі. Яны культывуюцца ў сістэме адукацыі, у сродках масавай інфармацыі, у ідэалогіі польскай дзяржавы», — адзначыў палітолаг.

Аляксей Дзермант канстатаваў: Польшча хоча ўплываць на сваіх усходніх суседзяў. «Мы бачым гэта і на прыкладзе Беларусі — спробы ўмяшання ў нашы ўнутраныя справы, арганізацыі дзяржперавароту, выгаднага Польшчы. Ва Украіне, зразумела, яны бачаць, што яны там ніяк асабліва не бяруць удзел, а павінны былі, на іх думку. І таму ўсё гэтыя актыўнасці. Ды нават у Літве праз польскую меншасць яны спрабуюць прасоўваць свой парадак дня. Польшча, асабліва цяперашні кіруючы клас, відома, спрабуе цяпер у такі пераломны гістарычны момант нешта для сябе тэрытарыяльна ўрваць, каб паспрабаваць пабудаваць вакол сябе нейкі блок або імперападобнае ўтварэнне. Уласна кажучы, гэтым рэваншызмам і тлумачыцца такая дастаткова дакучлівая гіперактыўнасць Польшчы ў адносінах да сваіх усходніх суседзяў», — падкрэсліў эксперт.

### Калонія Штатаў

Старшыня праўлення рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды» Вадзім Гігін у эфіры YouTube-канала «Галоўны. Тур» выказаў сваё меркаванне аб магчымасці падзелу Украіны і перспектывах захавання дзяржаўнасці гэтай краіны. «Тыя, хто лічыць, што ўвогуле знікне (Украіна. — **Рэд.**), Польшча зойме Галіцыю... Думаю, гэта фантомныя планы», — лічыць эксперт. Паводле яго слоў, НАТА свядома ствярала Украіну як шэрую зону, каб свае войскі туды не накіроўваць. «Сапраўды, ёсць такія гарачыя галовы ў Польшчы і Прыбалтыцы, якія гатовыя пайсці да канца. Хоць спраўкаваць ядзерную вайну. Але ў іх ёсць гаспадары, не яны вырашаюць. Нічога ім гэтага зрабіць не дадуць, — сказаў Вадзім Гігін. — Тое, што на нейкім этапе Польшча, можа быць, увядзе свае войскі, — гэта я не выключаю. Але гэта ні ў якім разе не будзе азначаць палітычнага падзелу Украіны».

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алег Гайдукевіч заявіў, што Злучаныя Штаты Амерыкі мараць зрабіць Еўропу сваёй калоніяй. Аб гэтым ён напісаў у сваім Telegram-канале. «Менавіта цяпер стала зразумела, навошта ЗША шмат гадоў кармілі сваіх сатэлітаў — Польшчу і краіны Прыбалтыкі. Менавіта цяпер відавочна, для чаго яны былі патрэбныя. Калі ЗША трэба будзе, то ў горан вайны кінуць менавіта Польшчу і Літву», — адзначыў Гайдукевіч. Ён дадаў, што «ніколі ЗША не ўкладвалі грошы проста так, гэта былі геапалітычныя плацдармы — Польшча і Прыбалтыка».

